Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
14 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 110 (28977)



ФУНДАМЕНТ ДОБРАСУСЕДСТВА
МС

ЧЭСЛАЎ НЕМЕН ВЯРНУЎСЯ Ў ГРОДНА
МС




9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Мы зараз разглядаем дзве канцэпцыі па дарожным зборы. Ёсць канцэпцыя ўрада, якая заключаецца ў захаванні схемы выплаты гэтага збору за доступ да дарожнай інфраструктуры. Па нашай задумцы, чалавек можа выбіраць, на які тэрмін ён купляе права карыстання дарожнай сеткай — на месяц, два, на год. Права выбару планавалася даваць самому аўтаамататару. Пры абмеркаванні з'явіўся альтэрнатыўны варыянт дарожнага збору — уключэнне яго ў кошт аўтамабільнага паліва. Такі варыянт таксама падрыхтаваны ўрадам і накіраваны на ўзгадненне. У любым выпадку, выбар з двух варыянтаў будзе зроблены. Каб дарогі будаваліся, своечасова рэканструяваліся, каб развівалася дарожная інфраструктура — на гэтыя мэты патрэбны сродкі. Без дарожнага збору, на жаль, не абысціся».*

# Зёлкі на Лучосе



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Збіральнікі лекавых траваў з вёскі Бабінавічы Лёзненскага раёна Яўгенія ВІШНЕЎСКАЯ і Уладзімір ЧЫЖЫКАЎ пачалі сезон нарыхтоўкі гаючых зёлак на пойме ракі Лучосы.

## КОРАТКА

- **Запасаў нафты ў Беларусі хопіць на 30-32 гады, калійных соляў — на 150 гадоў.**
- Больш за 7,6 тысячы га тарфянікаў адновяць у Беларусі ў 2019 годзе.
- **Стартап з ПВТ стварыў першую ў свеце інтуітыўную клавіятуру.**
- У Брэсце супрацоўнік Асвода за гадзіну выратаваў двух дзяцей, якія танулі.



- **Галоўны трэнер футбольнай зборнай Беларусі Ігар Крывушэнка падаў у адстаўку, якая была прынятая.**

# ПАРАДНЫЯ РАЗЛІКІ

**Дзень і час — 3 ліпеня, 21.00. Менавіта тады каля чатырох тысяч вайскоўцаў пройдуць у складзе 25 парадных разлікаў у гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі. У кожнага з іх — свая гісторыя, успаміны, што іх звязваюць з падзеямі Вялікай Айчыннай...**

**Сёння слова салдатам, якія будуць удзельнічаць у святочным парадзе. Яны служаць у 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе. На адну з трэніровак адправіліся і карэспандэнты «Звязды».**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Расклад на заўтра

# Лісты чакання скароцяцца

## Новы міністр расказаў, што яшчэ зменіцца ў сістэме аховы здароўя



Фота БелТА.

**Прызначаны 11 чэрвеня на пасаду міністра аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК адказаў на пытанні журналістаў. У прыватнасці, акрэсліў тое, што на яго думку варта мяняць у сістэме аховы здароўя. Найперш, трэба павышаць эфектыўнасць яе працы і скарачаць лісты чакання на такія запатрабаваныя даследаванні, як камп'ютарная тамаграфія. Таксама міністр паабяцаў, што будзе праведзена рэвізія арганізацый, якія займаюцца закупкай медтэхнікі і фармпрэпаратаў, каб не ўзнікала жадання атрымаць тут выгаду. Прааналізуюць у Міністэрстве аховы здароўя і цэны на імпартныя лекавыя прэпараты на беларускім рынку: каштаваць у паўтара-два, а то і ў пяць разоў даражэй, чым у суседзяў, яны не павінны.**

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X
19110
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

# Сітуацыя з ураджаем — на кантролі Прэзідэнта

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Хацько і намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дворнік далажылі Аляксандру Лукашэнку аб сітуацыі, што складваецца ў сельскай гаспадарцы, і дадатковых мерах, якія прымаюцца для захавання ураджаю. Аб неабходнасці дадатковых мер у сувязі з кліматычнымі ўмовамі кіраўнік дзяржавы гаварыў яшчэ напярэдадні.**

«На ўсходзе, на захадзе і ў цэнтры праблемы будуць у залежнасці ад таго, якія глебы. На лёгкіх глебах ужо, я гляджу, пачаліся пажаўценні пасеваў, таму трэба не ўпусціць час і ўбраць тыя пасевы своечасова. Цяпер ідзе нарыхтоўка сенажу — трэба ўсё гэта пакласці ў сянаж, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба па-гаспадарску паглядзець у сувязі з кліматычнымі ўмовамі, што зрабіць у раслінаводстве. Ні ў якім разе нічога не страціць».

Папаўняць збожжавую групу неабходна за кошт кукурузы, адзначыў Прэзідэнт: «Яна пакуль на ўсіх участках (я гэта сам кантралюю і бачу), нават на пясчаных глебах, трымаецца добра, таму трэба зрабіць стаўку на нарыхтоўку зерня з кукурузы». Пры гэтым, звярнуў ён увагу, неабходна дзейнічаць па правераных тэхналогіях, кансервуючы кукурузнае зерне ў рукавы, — гэта танней, чым сушыць.

Анатоль Хацько адзначыў, што кукурузы сёлета ў Беларусі пасеяна прыкладна на 110 тысяч гектараў больш за план. «Мяркуем дадаткова атрымаць мільён тон збожжа, каб забяспечыць жывёлагадоўлю. Калі кансерваваць зерне ў рукавы, гэта будзе зніжаць кошт кармоў, спрашчаць тэхналогію і павышаць вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі», — упэўнены міністр.

Сітуацыю ў сельскай гаспадарцы ён ацэньвае як неадназначную: разлікі на ўраджай закладзены добрыя, але ўсталявалася гарачыня, ападкі выпадаюць нераўнамерна і ў недастатковай колькасці: «Мы прымаем усе неабходныя меры, каб забяспечыць жывёлагадоўлю і харчовую бяспеку. Абследуем пасевы збожжавых у кожнай вобласці, у кожным раёне і, калі ёсць падсыханне, убіраем на зялёны корм і праводзім перасяванне прамежкавымі культурамі». Кіраўнік галіны паведаміў, што сёлета перасеяны ўжо азімыя культуры, якія былі ў дрэнным і нездавальняючым стане. Прыняцце аператыўных рашэнняў дае магчымасць нарыхтаваць дадатковыя кармы.

У цэлым ураджай збожжавых чакаецца вышэйшы за леташні. Збожжа для харчовых мэт у Беларусі будзе дастаткова, запэўніў Анатоль Хацько. Ёсць яшчэ леташнія астаткі мукі і круп, працягваецца рэалізацыя мукі на экспарт. Але, як падкрэсліў міністр, не варта разлічваць на мінулагодніх рэзервы — неабходна нарыхтаваць максімальны ўраджай.

На наступным тыдні адказныя асобы далажаць Прэзідэнту аб тым, як ідуць справы ў беларускім раслінаводстве.

**Паводле БелТА.**

## Парламенцкі дзённік

# З УЛІКАМ АБСТАВІН

## Прыняты папраўкі ў 328-ы артыкул Крымінальнага кодэкса

**Гэта адбылося на этапе другога чытання на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Нагадаем, што згаданы вышэй артыкул у тым ліку рэгламентуе пакаранне за незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў.**

Што ж змянілася? Памяншаецца ніжняя мяжа пакарання з пяці да трох гадоў пазбаўлення волі па частцы 2 і з васьмі да шасці гадоў пазбаўлення волі па частцы 3.

Як адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, такое рашэнне не з'яўляецца паслабленнем для наркадылераў і збытчыкаў наркотыкаў. Ён растлумачыў, што такі падыход дазволіць судам прымяняць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі па наркатычных артыкулах больш дыферэнцыравана — з улікам асобы вінаватага, узросту, характару і ступені грамадскай небяспекі дзеі, а таксама ўсіх абставін здзяйснення.

***Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Аляксандр БАГДАНОВІЧ*** расказаў журналістам, што такая ініцыятыва разглядалася яшчэ дэпутатамі пятага склікання, збіралася мноства рабочых груп. Безумоўна, паўплывала і грамадская думка. Такім чынам, выніковае рашэнне парламентарый назваў выверaным.

Ён звярнуў увагу, што папраўкі могуць аблегчыць пакаранне тым, хто пераступіў рысу па няведанні. А вось верхняя мяжа засталася без змен — таму за мэтанакіраваны незаконны абарот наркотыкаў пакаранне застаецца цвёрдым (да васьмі гадоў па частцы 2 і да 15 гадоў па частцы 3).

Таксама на сесіі дэпутаты ў першым чытанні прынялі законапраект «Аб персанальных даных» — уступленне асноўных палажэнняў у сілу плануецца праз год пасля яго афіцыйнага апублікавання. Дакладваў па гэтым пытанні **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ.**

Што тут трэба ведаць: распрацоўшчыкі вызначылі, што персанальныя даныя — гэта любая інфармацыя, якая адносіцца да ідэнтыфікаванай фізічнай асобы або фізічнай асобы, якая можа быць ідэнтыфікавана на падставе такой інфармацыі.

Плануецца падзяліць персанальныя даныя на дзве катэгорыі — агульнадаступныя (не падлягаюць абароне) і спецыяльныя (падлягаюць). У другую катэгорыю ўваходзяць, напрыклад, пол, палітычныя ці рэлігійныя перакананні, судзімасць.

Навеаўвядзенне законапраекта — замацаванне магчымасці атрымаць згоду фізічных асоб на пэўныя дзеянні з іх персанальнымі данымі ў электроннай форме.

Яшчэ Вадзім Іпатаў прывёў у прыклад журналістам сітуацыю, якую законапраект зможа адрэгуляваць: напрыклад, запоўніў чалавек заяву на дысконтную карту ў краме, пакінуў асабістыя даныя, а яму потым тэлефануюць з іншых крам. Законапраект навядзе тут парадак: па-першае, грамадзяне змогуць даведацца пра перадачу сваіх персанальных даных трэцім асобам. Па-другое, у любы час грамадзянін будзе мець права патрабаваць ад аператараў спыніць любыя дзеянні з яго персанальнымі данымі, калі для гэтага няма законных падстаў.

Усяго на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў было разгледжана больш за 15 пытанняў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Аманскім заліве былі атакаваны два танкеры



Паводле інфармацыі тайваньскай кампаніі-эксплуатанта CPC Corp, у нарвежскі танкер Front Altair трапіла тарпеда, прычыны пашкоджання другога танкера — японскай Kokuka Courageous — не ўдакладняюцца. Front Altair выконваў заказ для тайваньскай дзяржкампаніі CPC Corp і перавозіў 75 тысяч тон нафты (пабочны прадукт нафтаперапрацоўкі), а Kokuka Courageous — метанол. Адзначаецца, што іранскія вайскоўцы-ратавальнікі знялі з атакаваных танкераў 44 маракі. Іх даставілі на іранскую тэрыторыю, паколькі інцыдэнт адбыўся ў тэрытарыяльных водах Ірана. Пасля інцыдэнту рэзка выраслі цэны на нафту. Па звестках Reuters, яны падняліся на чатыры працэнты.

### ЗША і Польшча падпісалі дэкларацыю аб сумеснай абароне

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што ён разглядае магчымасць перакідвання большай колькасці амерыканскіх войскаў з Германіі ў Польшчу. Пры гэтым дадатковыя войскі ЗША ў Еўропу дасылаць не плануюць. Прымаючы Анджэя Дуду ў Авальным кабінеце, Трамп падкрэсліў сваё жаданне ўзмацніць ваенную прысутнасць Злучаных Штатаў у гэтай усходнееўрапейскай краіне. У Польшчы ўжо знаходзіцца каля 5000 амерыканскіх салдат у рамках аперацый НАТА. На тэрыторыі ўсходнееўрапейскай краіны вырашана размясціць эскадрыллю амерыканскіх разведвальна-ўдарных беспілотнікаў MQ-9. Таксама Трамп абвясціў, што Польшча замовіла 30 амерыканскіх знішчальнікаў F-35.



### У саборы Парыжскай Божай Маці пройдзе першая пасля пажару імша



Яна адбудзецца 15—16 чэрвеня, паведаміў настаяцель Нотр-Дама Патрык Шавэ ў інтэрв'ю штотыднёвіку Famille chretienne. «Дата, якая была абрана, — сімвалічная. Гэта будзе свята асвячэння сабора», — заявіў Шавэ. Як вядома, найбуйнейшы ў гісторыі пажар у саборы Парыжскай Божай Маці адбыўся ўвечары 15 красавіка. Прыярытэтнай з'яўляецца версія пра выпадковы характар пажару.

# У Бішкеку праходзіць саміт ШАС

**Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва распачалася сёння ў сталіцы Кыргызскай Рэспублікі з нарады ў вузкім складзе, якая традыцыйна пройдзе ў закрытым рэжыме.**

Будуць абмяркоўваць стан і перспектывы ўзаемадзеяння па наступных кірунках: бяспека, супрацьдзеянне тэрарызму і наркатрафіку, пытанні развіцця эканомікі, прамысловасці, супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, а таксама становішча спраў у Афганістане і сітуацыя на Блізкім Усходзе.

Затым удзельнікі саміту правядуць пасяджэнне ў пашыраным складзе з удзелам кіраўнікоў дэлегацый краін-назіральніц — тут планецца выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Нагадаем, рашэнне аб павышэнні статусу Беларусі ў ШАС да назіральніка было прынята ў ліпені 2015 года на саміце кіраўнікоў дзяржаў ва Уфе. На пасяджэнні беларускі лідар агучыць пазіцыю нашай краіны па актуальнай міжнароднай тэматыцы і развіцці супрацоўніцтва ў рамках гэтага інтэграцыйнага аб'яднання.

Чакаецца, што па выніках саміту будзе падпісана Бішкекская дэкларацыя і значны пакет іншых дакументаў.

**Паводле БелТА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Лот № 1: зерносклад лит 1/к (в состав входят: сарай лит 1, пристройка Б1/к) общей площадью 1335,6 кв. м с инв. № 610/ С 59705,** расположенный на земельном участке с кадастровым номером 620885206101000150 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,9933 га**, по адресу: **Минская область, Борисовский район, Моисеевщинский с/с, аг. Моисеевщина.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **160 283,18** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **16028,32** бел. руб.).

**Лот № 2: склад мешкотары общей площадью 207,4 кв. м с инв. № 622/С-45500**, расположенный на земельном участке с кадастровым номером **625450100001004547** (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,0414 га**, по адресу: **Минская область, Столбцовский район, г. Столбцы, ул. Багинского, 18А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **43 261,90** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **4 326,19** бел. руб.).

**Условия продажи:**

поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 3 (трех) процентов, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.05.2019.

Аукцион состоится **04.07.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовдрев» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом** имущества в составе:

**деревообрабатывающий цех, инв. № 610/С-29193 общей площадью 1207 кв. м, ремонтная мастерская № 1, инв. № 610/С-29199 общей площадью 1156 кв. м, котельная инв. № 610/С-29213 общей площадью 151 кв. м, операторская будка (АЗС), инв. № 610/С-59658 общей площадью 16,2 кв. м, здание пульта управления, инв. № 610/С-59659 общей площадью 32,8 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 640400000012000456 площадью 4,8674 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**контора инв. № 610/С-29182 общей площадью 398 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 640400000012000455 площадью 0,2575 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**трансформаторная подстанция № 1, инв. № 610/С-57102 общей площадью 63,6 кв. м, трансформаторная подстанция № 2, инв. № 610/С-57103 общей площадью 63,3 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100012001194 площадью 0,0257 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**забор (ограждение) с инв. № 01120008;**

**водопроводная сеть с инв. № 610/С-59810;**

**трансформаторная подстанция ТМ630/10-7041 с инв. № 01340432;**

**трансформатор силовой ТМ630/10 с инв. № 01340434.**

**Начальная цена объектов** с НДС (20 %) – **480 307,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены **– 48 030,70 бел. руб.). Цена снижена на 20 % от начальной стоимости.**

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 12.03.2019.

Аукцион состоится **02.07.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# Лісты чакання скароцяцца

## Павялічыць прапускную здольнасць

Міністр падкрэсліў, што трэба звярнуць увагу на даступнасць медыцынскай дапамогі, працаздольнасць высокатэхналагічнага абсталявання, доступ да такіх відаў дыягностыкі і лячэння.

— Медыцынскія работнікі, зыходзячы з інтарэсаў хворага, вызначаюць чарговасць доступу. Ёсць назалогіі, дзе выкананне таго ж МРТ праз адзін-два месяцы ніякім чынам не зменіць сітуацыю. А ёсць выпадкі, калі прамаруджванне нават на шэсцьвосем гадзін негатыўна скажацца на пацыенце. Важна растлумачыць, што калі гэта сапраўды патрабуецца, у нас ёсць усе магчымасці аказаць дыягнастычную дапамогу. У тых выпадках, калі гэта не мае вялікага клінічнага значэння, патрабуецца пэўнае чаканне. Мы будзем працаваць над тым, каб лісты чакання былі як мага карацейшыя і прымяняюся дакладны дыферэнцыраваны падыход, — паабяцаў Уладзімір Караніk.

Ён звярнуў увагу, што прапускную здольнасць тых жа камп'ютарных тамографаў можна павялічыць:

— Мы лічым, што без сур'ёзных фінансавых укладанняў можна павялічыць прапускную здольнасць гэтых апаратаў у 1,5-2 разы. Сёння плануецца рэалізацыя пілотнага праекта ў Мінску. Для гэтага ёсць пэўныя напрацоўкі, і я мяркую, што на працягу бягучага квартала яго ўдасца ажыццявіць. Калі праект акажацца паспяховым, такая практыка будзе распаўсюджана на ўсю краіну. Калі ўсё атрымаецца, гэта істотна зніме нагрузку на сацыяльную сферу. Усё ж такі чаканне дыягнастычнага даследавання выклікае часта негатыўную рэакцыю пацыентаў і наша тлумачэнне, што вялікага клінічнага значэння гэта не мае, чалавека не супакойвае.

Міністр расказаў, што цяпер праводзіцца аналіз эфектыўнасці выкарыстання высокатэхналагічнага абсталявання, у прыватнасці апаратаў КТ і МРТ. Міністэрства аховы здароўя збірае інфармацыю аб сярэдняй працягласці яго прастою, аб кошце рамонту і камплектуючых. Затым гэтыя звесткі параўнаюць з сітуацыяй у суседніх краінах. І, магчыма, будзе нагода для размовы з вытворцамі наконт таго, што постгарантыйнае абслугоўванне павінна праводзіцца па-іншаму, а само абсталяванне мусіць працаваць больш эфектыўна.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота БелТА.

## Паскардзіцца на кошт імпартных лекаў

Яшчэ адзін кірунак, дзе плануецца перагледзець падыходы, — эканамічная эфектыўнасць сістэмы аховы здароўя. Гэта хуткасць і кошт закупак, цана лекавых сродкаў і бесперабойнае забеспячэнне медыцынскіх устаноў.

— Мы праводзім рэвізію работы арганізацый, якія займаюцца закупкай медтэхнікі і фармпрэпаратаў. Будуць рэгламентаваны дакладныя тэрміны і працэдура закупкі, каб ліквідаваць магчымасць уплыву асобных работнікаў на прыняцце рашэння і хуткасць праходжання дакументаў. Барацьба з карупцыяй — гэта выпрацоўка дакладных правілаў, калі ад канкрэтнага выканаўцы не залежыць прыняцце рашэння. Любое адхіленне ад правілаў будзе выклікаць пытанні і пільную ўвагу. І ахвотных адхіляцца ад патрабаванняў з неаб'ектыўных прычын з імкненнем атрымаць выгаду не застанецца. Будзем мяняць механізмы закупак, удасканальваць іх такім чынам, каб гэтыя працэсы былі адкрытыя для грамадства, зразумелыя для ўсіх удзельнікаў рынку і даступныя для кантролю на любых этапах.

Звярнуў увагу міністр і на тое, што людзей даўно турбуе пытанне кошту імпартных лекаў. Некаторыя прэпараты ў нас аказваюцца ў разы даражэйшыя, чым у суседніх краінах.

— У нашых планах — шчыльна працаваць з прадстаўнікамі IT-сферы для распрацоўкі вэб-платформы, дзе кожны грамадзянін у рэжыме анлайн зможа размясціць інфармацыю, што дзесьці за мяжой купіў прэпарат у 1,5-2 разы танней, чым у нас, — падзяліўся Уладзімір Караніk. — Калі надбаўка 30—40 %, яе яшчэ можна растлумачыць асаблівасцямі дастаўкі. Але калі цана вышэйшая ў 1,5-2, тым больш у пяць разоў — гэта нічым немагчыма растлумачыць. Мы плануем стварыць такую платформу і аналізаваць усе звароты, пасля чаго патрабаваць або прывядзення цэн у адпаведнасць, або дакладнага іх абгрунтавання. Калі няма магчымасцяў знізіць цэны ў сувязі з пазіцыяй вытворцы, будзем даваць заданне нашым фармпрадпрыемствам, каб забяспечыць даступныя лекавыя сродкі.

Уладзімір Караніk расказаў, што ў першы дзень на новай пасадзе даў загад прааналізаваць лекавае забеспячэнне. Прычым звярнуць увагу не толькі на праблемы, якія маюцца з наяўнасцю тых ці іншых прэпаратаў сёння, але і на будучае: з якімі медыкаментамі могуць узнікнуць пытанні ў 2020—2021 годзе з прычыны заканчэння іх рэгістрацыі.

## Не абмяжоўваць даступнасць меддапамогі

Міністр адзначыў, што падрыхтоўка да Еўрапейскіх гульняў знаходзіцца пад пільнай увагай, і правядзенне гэтых спаборніцтваў не ўшчамляе правы нашых грамадзян на атрыманне медыцынскай дапамогі.

— Перыядычна ў блогасферы вядуцца размовы, што правядзенне Гульняў абмяжуе доступ жыхароў Мінска да хуткай дапамогі, да стацыянараў, што ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі вылучаецца цэлая зона, куды ўвогуле немагчыма трапіць простаму грамадзяніну. Растлумачу, што на сёння гэта толькі адно аддзяленне, якое выйшла з рамонту. Пра тое, што туды ў апошнія паўгода доступу грамадзян не было, бо яно рамантавалася, забылі сказаць. Была прааналізавана нагрузка на ложкавы фонд Мінска за мінулы год, і высветлілася, што ў чэрвені людзі з'язджаюць за межы горада, частка ложкавага фонду выкарыстоўваецца менш эфектыўна, частка проста пустуе. Таму нават не ўвесь пустуючы фонд быў задзейнічаны, каб забяспечыць імі спартсменаў. Для іх вылучана звычайнае аддзяленне, толькі з інфармаваннем на англійскай мове і персаналам, які валодае замежнымі мовамі.

Таксама міністр растлумачыў, што брыгады хуткай дапамогі ў летні час таксама працуюць менш напружана. На Еўрапейскіх гульнях будуць задзейнічаны брыгады з рэзерву. Таксама ў Мінск прыбудзе 30 брыгад хуткай дапамогі з рэгіёнаў, у прыватнасці з буйных гарадоў, дзе яны мелі невялікую нагрузку.

## Зніжаць смяротнасць ад анкалогіі

Асобна спыніўся міністр на пытаннях анкалагічных хвароб (па спецыялізацыі Уладзімір Караніk — хірурганколаг, апошнія гады ён узначальваў Мінскі гарадскі клінічны анкалагічны дыспансер). Ён растлумачыў, што нягледзячы на павелічэнне апошнім часам анкалагічных хвароб, смяротнасць ад іх зніжаецца.

— Тэндэнцыя, калі на першае месца па смяротнасці выходзяць анкалагічныя хваробы, назіраецца ў «старых» краінах Еўропы. Наша насельніцтва пакуль больш маладое. Таму ў нас на першае месца яна выйдзе не раней, чым праз 20 гадоў. У нас паляпшаецца дыягностыка. Калі ў 2000 годзе са ста захварэлых памірала 57 чалавек, то летась гэты паказчык склаў 31,5. Мой знаёмы прафесар з Бараўлян калісьці абараняў дысертацыю па павелічэнні працягласці жыцця дзяцей з вострым лейкозам на паўтара месяца. Сёння 90 % такіх дзяцей цалкам вылечваецца і жыве паўнацэнным жыццём. Калі анкалагічныя праблемы паднімуцца на першае месца ў структуры смяротнасці, у анколагаў будзе нашмат больш інструментаў у барацьбе з імі, — перакананы Уладзімір Караніk.

**Алена КРАВЕЦ.**

## МАГЧЫМАСЦЬ ВЫКАЗАЦЦА

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 15 чэрвеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі будуць адказваць з 9.00 да 12.00 прадстаўнікі ўлады:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Стыхія

# Калі плюс 34 і больш

## Нават уначы ў нас месцамі да 21-22 цяпла

**Вось ужо лета пачалося, без размінкі, без перапынкаў, адразу гарачым паветрам ды ва ўсёй нашай краіне. Яшчэ больш гарачае сухое надвор'е чакаецца ў нас і ў выхадныя, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**


Фота БелТА.

Выключна анамальная спякота была ў нас у сераду. У гэты дзень тэмпература паветра амаль паўсюдна дасягнула 31—34 градусы, **самыя высокія значэнні адзначаны ў Жлобіне — 34,7 цяпла.** У асобных раёнах краіны былі перавышаныя абсалютныя чэрвеньскія максімумы тэмпературы паветра за ўвесь перыяд назіранняў. У сувязі з гарачым сухім надвор'ем адзначаецца высокая пажаранебяспека ў лясах. Да канца тыдня будзе пераважаць гарачае без ападкаў надвор'е, толькі ў пятніцу месцамі чакаюцца лакальныя навальнічныя дажджы, а ў выхадныя па поўначы краіны — паслабленне спёкі.

Сёння ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра будзе ад плюс 28 да 33 градусаў, месцамі па Брэсцкай і Гомельскай абласцях паветра прагрэецца да 34 цяпла. У суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах Віцебскай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—20 цяпла, па поўдні краіны — 21-22 градусы. Удзень будзе ад 24 градусаў па поўначы да 33 градусаў вышэй за нуль па поўдні краіны.

Дажджоў не будзе і ў нядзелю. У гэты дзень тэмпература паветра ўначы складзе ад 12 да плюс 19 градусаў, па паўднёвым захадзе — 20-22 цяпла. Удзень будзе ад 24 градусаў па паўночным усходзе да плюс 33 градусаў па поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту ўначы месцамі па поўначы, а ўдзень у асобных раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 15 да плюс 22 градусаў. Удзень будзе ў асноўным 28—34 цяпла, толькі па паўночным захадзе краіны — да плюс 25-27 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Свидетельство о государственной регистрации, устав иностранного частного торгового унитарного предприятия «Торговая группа «Богач» (УНП 191754990) **считать недействительными в связи с утратой.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ с № 2492586 по № 2492590 **считать недействительными.**

УНП 100122726

24 июня 2019 года в 13.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров «ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении локальных нормативных актов Общества.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 12.30 до 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенности).

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 17 июня 2019 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 18.06.2019 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 400078331

# Жыхар Светлагорскага раёна выкапаў вінтоўку, а яна стрэліла

**У Светлагорскую бальніцу днямі даставілі 68-гадовага жыхара раёна. Мужчыну паставілі дыягназ: скразное агнястрэльнае раненне. У сітуацыі разбіраліся супрацоўнікі раённага аддзела ўнутраных спраў.**



Як паведамляецца на афіцыйным сайце УУС Гомельскага аблвыканкама, пенсіянер вырашыў зрабіць пясочніцу для ўнукаў на тэрыторыі домаўладання. Падчас земляных работ знайшоў зброю часоў Вялікай Айчыннай вайны. Як аказалася, у яго рукі трапіла самазарадная вінтоўка сістэмы Токарава (СВТ-40). Гаспадар дома, узяўшы ў рукі бензарэз, пачаў яе пілаваць. У гэты момант і адбыўся стрэл. Магазін вінтоўкі быў пусты, але адзіны патрон знаходзіўся ў патронніку. На шчасце, акрамя пенсіянера нікто не пацярпеў.

Па гэтым факце цяпер праводзіцца праверка. Прызначаны балістычная і судова-медыцынская экспертызы. Пацярпелы знаходзіцца на лячэнні ў бальніцы.

У сувязі з гэтым міліцыя яшчэ раз нагадвае, што юрыдычным і фізічным асобам забараняецца захоўваць і выкарыстоўваць знойдзеную альбо перададзеную ім зброю, уласнікамі якой на законных падставах яны не з'яўляюцца. Такая зброя падлягае неадкладнай здачы ў органы ўнутраных спраў.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# ПАРАДНЫЯ РАЗЛІКІ

## «АДДАЁМ ДАНІНУ ПАМЯЦІ»

**Сяргей ШАПНЕЎСКІ, яфрэйтар:**



— ...Раніцай аднаго дня ў 1943 годзе немцы ачапілі вёску, дзе жыла мая прабабуля, якая была тады дзяўчынкай. Усіх падлеткаў і людзей нясталага ўзросту пагналі на чыгуначную станцыю. Там іх пагрузілі ў таварныя вагоны. Куды ехаў той цягнік — у канцлагер або ў Германію на кірмаш рабоў — невядома. Але, на шчасце, партызаны падарвалі рэйкі. Цягнік паляцеў пад адхон. Узнялася мітусня, страляніна. Людзі пачалі разбягацца. Прабабуля ўцякла ў поле. Сядзела яна там больш за суткі. Пасля яе падабралі партызаны. З імі яна і дачакалася вызвалення.

Я сам з Магілёва. Скончыў базавую школу і пайшоў у ліцэй пры Беларуска-расійскім універсітэце. Затым адвучыўся ў ім тры курсы і падумаў, што адной адукацыі малавата... Пайшоў атрымліваць другую — і пасля атрымання дыплома прыйшла павестка. Ужо тады ўцягнуўся ў графік, калі сыходзіш з дому а 7-й раніцы і прыходзіш толькі а 10-й вечара. Гэта мне дапамагло хутчэй акліматызавацца ў войску.

Прызваўся я летась 22 лістапада. Дома чакаюць родныя, блізкія, дзяўчына. Калі даведаліся, што буду ўдзельнічаць у парадзе, вырашылі, што прыедуць у Мінск паглядзець. Будуць тут і сябры, і калегі з работы. А гэта ўсё толькі павялічвае адказнасць, калі аддаеш даніну памяці тым вялікім падзеям. 75 гадоў з даты вызвалення Беларусі — гэта вялікая дата. Для многіх з нас гэта другі парад. Мы таксама ўдзельнічалі ў святочным шэсці 9 мая ў Жодзіне.

Штодня ў нас на зарадку аддаецца не менш за гадзіну. Пасля невялікага перапынку пераходзім да страявой падрыхтоўкі. Гэта хада па квадратах для выверанага кроку, пасля ў складзе шарэнг і, нарэшце, каробак. Пасля абеду і невялікага адпачынку трэніроўкі працягваюцца. На пляцы дывізіі мы праходзім тры разы на тыдзень — па панядзелках, пятніцах і суботах. А з аўторка да чацвярга ў нас гарнізонныя трэніроўкі.

Яны пачаліся амаль два месяцы таму. Спачатку нас адабралі ў сваіх падраздзяленнях, як адных з найлепшых страевікоў, пасля адправілі сюды. Спачатку мы трэніраваліся хадзіць шарэнгай. Толькі пасля гэтага пачалі выстройвацца шарэнгамі ў каробку. Гэты падрыхтоўчы працэс заняў тыдні два.

Праз пяць месяцаў у запас. Думаю вярнуцца ў Магілёў і працаваць інжынерам у адной з сетак крамаў — там, дзе і быў да прызыву.

## «ХОЧАМ ПРАЙСЦІ ЛЕПШ ЗА КІТАЙЦАЎ»

**Уладзіслаў КРАМЫНІН, яфрэйтар:**



— Так супала, што я сам з Рагачова і служу ў брыгадзе, якая носіць імя «Рагачоўская». Я старшы наводчык гранатамётнага ўзвода. Праўда, спярша мяне адпраўлялі ў чыгуначныя войскі ў Слуцк. І калі прыехаў у Гомель на зборны пункт, то даведаўся, што ўсё ж такі паеду служыць сюды. Да войска я працаваў трактарыстам у суседняй вёсцы.

Я таксама ўдзельнічаў у парадзе на 9 мая ў Жодзіне. Родныя і блізкія з радасцю аднесліся да навіны, што я пайду святочным крокам на парадзе 3 ліпеня ў сталіцы.

Зараз нам даецца больш часу на падрыхтоўку. Увогуле, хочам прайсці лепш за кітайцаў. Нам паказвалі ролікі з тым, як яны ідуць страявым крокам — заглядзецца можна. На парадзе я пайду ў сёмай шарэнзе, прыкладна ў цэнтры.

На «грамадзянцы» я займаўся паркурам — майстэрствам пераадольваць розныя фізічныя перашкоды з дапамогай скачкоў. Ён дадаў мне вынослівасці. Адзіны мінус — з-за таго, што я часта ездзіў на веласіпедзе, пры хадзе страявым крокам першы час згіналася нага. І нават крыху шкадую, што нас у школе так і не звадзілі ў часць. Усё ж такі павесткі прыйдуць усім, рана ці позна, а агульнае ўяўленне пра тое, што цябе чакае, мець трэба. Праз паўгода мне ў запас. А да таго нас чакаюць брыгадныя і батальённыя тактычныя вучэнні.

## «БАБУЛЯ З ДЗЕДАМ ВЕЛЬМІ МНОЮ ГАНАРАЦЦА»

**Антон КРЫВАЛЬЦЭВІЧ, радавы:**



— Мая бабуля нарадзілася ў 1943 годзе ў вёсцы Завыхад Салігорскага раёна. Яна знаходзіцца на памежжы трох абласцей — Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай. Непадалёк ад Завыхада ёсць яшчэ адна вёска — Даманавічы. І вось праз некалькі дзён пасля таго, як нарадзілася бабуля, немцы загналі ўсіх жыхароў Даманавіч у хату і падпалілі яе. Вестка пра жудаснае злачынства ў Даманавічах хутка далялела да Завыхада. Жыхары гэтай вёскі вырашылі ўцячы, балазе, мясцовасць там — глухія лясы і балоты. Але яны баяліся, што маленькае дзіця — мая будучая бабуля — закрычыць і незнарок выдасць іх. Таму вырашылі пакінуць яе ў вёсцы... Але адышоўшы ўсяго некалькі крокаў, рэзка перадумалі і забралі немаўля з сабой у лес.

Бабуля з дзедам вельмі ганарацца тым, што я буду ісці ў парадназ каробцы на Дзень Незалежнасці. Праўда, з-за ўзросту ім ужо вельмі складана дабрацца ў Мінск. Таму абяцалі глядзець парад па тэлебачанні. А вось хто прыедзе на парад, дык гэта мой дзядзька. Калісьці ён адслужыў тры з паловай гады на флоце. Крыху, праўда, пераслужыў, але ж карабель з рэйса ў адкрытым акіяне назад так проста не вернеш. А бацька служыў напрыканцы 1980-х у Туркменіі на мяжы з Афганістанам.

Я сам з Гомеля. Пяць гадоў адвучыўся на інжынера-энергетыка ў тэхнічным ВНУ. А пасля — усё як ва ўсіх саслужыўцаў — прыйшла павестка, камісія прызнала прыдатным да службы... Спярша я трапіў у 72-і Аб'яднаны навучальны цэнтр у Пячах. Мяне там вучылі рамонту і захаванню танкавага і самаходнага артылерыйскага ўзбраення. Затым я трапіў у 120-ю брыгаду. Цяпер я зараджальшчык.

Да войска займаўся спортам на аматарскім узроўні. Хадзіў у трэнажорку, бегаў на стадыёне. Гэта дапамагае цяпер, падчас рэпетыцыйных прагонаў. Асабліва калі ўлічыць, што пайду ў першай шарэнзе. І патрабаванні да яе вельмі высокія — трэба задаваць тэмп тым, хто ідзе ззаду цябе. На цэнтральнай пазіцыі, дзе буду я, адначасова і лягчэй, і складаней. Тое, што ты трымаеш раўненне направа — гэта плюс, што злева, цябе не вельмі датычыцца. А вось падчас рэпетыцый бывала так, што або правы, або левы фланг крыху ідуць убок. І шарэнга аб расцісказалася, або сціскалася. Але раз за разам гэтых выпадкаў станавілася меней.

Як нас адбіралі? Тыя, хто добра асвоілі страявую падрыхтоўку, на пастраенні называлі свой рост. Першая шарэнга, як правіла, прызначана для самых высокіх. Праўда, шмат волатаў з ростам пад два метры не аказалася. І таму я з ростам у 187 сантыметраў трапіў у першую шарэнгу, хоць звычайна там ідуць вайскоўцы з ростам за 190. Допуск у шарэнзе па росце не перавышае лічаных сантыметраў.

Да звальнення ў запас у мяне крыху больш за пяць месяцаў. Планаў, чым буду займацца па-за межамі арміі, пакуль не будую — усё мяняецца вельмі хутка. Будзем дзейнічаць па сітуацыі.

## «САМАЕ ВАЖНАЕ — ПРАВІЛЬНА ЎЗДЫМАЦЬ НАГУ»

**Максім МЯРЗЛОЎ, яфрэйтар:**



— Ваявалі мае абодва прадзеды. Адзін з іх, Дабрынін Міхаіл Валер'евіч, загінуў пад Курскам у 1943 годзе падчас адной з самых кровапралітных бітваў. Больш нічога пра яго не ведаю. Прадзед па лініі бацькі Мярзлоў Арцём Іванавіч прапаў без вестак у пачатку вайны. І больш пра яго не засталося ніякай інфармацыі...

Мне 19 гадоў. Я родам з Салігорска. Пасля таго як скончыў 11 класаў, паступіў у Політэхнічны каледж у Мінску. Але праз два месяцы забраў дакументы — зразумеў, што будучая спецыяльнасць «тэхнік-электрык» — не маё. А пасля споўнілася 18 гадоў, і вясной мінулага года прыйшла павестка. У любым разе, думаю, што калі чалавек прыдатны да войска, то лепш прайсці гэты этап раней, а не ў 26—27 гадоў. Там ужо з'явіцца вельмі шмат «якараў».

Служу 13 месяцаў. Вучыўся на наводчыка-аператара БМП-2. Праз паўгода трапіў у 120-ю брыгаду па той жа спецыяльнасці. Але як жа наводчык-аператар трапіў у пешую калону? Гэта было маё жаданне. Калі ішоў адбор, то выводзілі на пляц усю брыгаду і размяркоўвалі па росце ўсіх ахвотных. Мой батальён быў на баявым дзяжурстве, і ніхто з нас прыняць удзел у адборы не мог. Калі батальён зняўся з дзяжурства, я з трыма саслужыўцамі падышоў да намесніка камандзіра брыгады палкоўніка Дзмітрыя Бурдукевіча, і мы папрасіліся ўдзельнічаць у парадзе. Усё ж такі для нас гэта было б гонарам — прайсці парадным крокам у гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі. Мы атрымалі дабро, і на наступны дзень пачалі першую трэніроўку.

Увесь парадны разлік пасялілі ў асобную казарму, каб у нас быў свой распарадак дня. Напрыклад, мы снедаем раней за іншых, а вячэраем пазней, паколькі штодня ходзім у лазню. Адбой у нас а 9-й гадзіне вечара, пад'ём — як і ва ўсіх, а 6-й. А паколькі нас пасялілі ў казарме на першым паверсе, то і спякота там адчуваецца не так моцна.

Я на «грамадзянцы» займаўся боксам і лёгкай атлетыкай. Апошняя дала мне вынослівасць, асабліва на гарнізонных трэніроўках. Было заўважна, што ў тых, хто спортам не займаўся, сілы канчаліся значна хутчэй.

Самае важнае падчас трэніровак — навучыцца правільна ўздымаць нагу. Далей усё проста: адзін пад'ём — адзін удар — як вынік, адзін дакладны страявы крок. Пры гэтым трэба ўлічыць, што чым чалавек вышэйшы, тым і даўжыня кроку ў яго звычайна большая. А па росце шарэнгі адрозніваюцца ў бок паніжэння. І таму ўсё нам дамагаліся таго, каб мы падымалі нагу на адзін і той жа пэўны ўзровень. І дыстанцыя тады трымаецца аўтаматычна.

А наперадзе нас чакаюць вучэнні ў Расіі. Праўда, усё гэта будзе пасля парада. Гэта мерапрыемства дзяржаўнага ўзроўню. І трэба паказаць сябе з найлепшага боку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

**Поўную версію матэрыялу чытайце на сайце zviazda.by**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Беларускія кніжнікі — у Партугаліі

**Дэлегацыя беларускіх кнігавыдаўцоў, якія прадстаўляюць міністэрствы інфармацыі і адукацыі нашай краіны, працуюць на 89-м Лісабонскім кніжным кірмашы ў Партугаліі. З шэрагам пытанняў адносна ўдзелу Беларусі ў гэтым прадстаўнічым еўрапейскім свяце кнігі мы звярнуліся да кіраўніка дэлегацыі — дырэктара ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа» Ігара МАЛАНЯКА.**

***— Ігар Мікалаевіч, здаецца, упершыню беларусы ўдзельнічаюць у кірмашы ў Лісабоне?***

— Так. Прынамсі, нам нічога не вядома пра ранейшы ўдзел беларускіх выдаўцоў, паліграфістаў у сапраўды грандыёзным выставачным праекце. Кірмаш у Партугаліі ладзіцца з 29 мая да 16 чэрвеня. Уражваюць бясконцыя рады кіёскаў, павільёнаў, дзе выкладзена прадукцыя выдавецтваў, дарэчы, не толькі кнігі, але і газеты, часопісы. Плошча пад гэта дзейства прадстаўлена па традыцыі ў парку Эдуарда VII. Кірмаш праводзіцца з 1930-х гадоў. І гэта свята стала культурным здабыткам у Партугаліі.

***— Што ўжо прыкмецілі асабліва ў праграме 89-га Лісабонскага кніжнага кірмашу?***

— Шмат лекцый, шмат сустрэч з пісьменнікамі. Такой жывой камунікацыі, прызнацца, у нас не хапае. Мы яшчэ толькі вучымся гэтаму, яшчэ толькі развіваем асяроддзе зносін пісьменніка з чытачамі. Відаць па ўсім, што наведвальнікі ў задавальненні ад набыцця кніг — як навінак, так і букіністычнай кнігі. Уражвае гнуткая сістэма зніжак. На дзіцячую літаратуру зніжкі складаюць да 50 працэнтаў ад кошту кнігі. Таму бацькі і ідуць на кірмаш з малымі дзецьмі, таму тут проста тоўпяцца падлеткі.

***— На якіх мовах прадстаўлены кнігі на кірмашы?***

— Канешне ж, найперш — на партугальскай. Але шмат кніг і на англійскай, рускай, іншых мовах. Ёсць кнігі і на беларускай мове. І гэта не толькі з асартыменту, які мы прывезлі з Беларусі.

***— Значыць, можна выбудоўваць кнігагандлёвую лагістыку і з Партугаліяй?***

— Чаму б і не?! Мяркуйце самі, краіна не так і далёка ад Беларусі. Па-другое, статыстыка сведчыць, што беларусы едуць у Партугалію. І не толькі адпачываць, але і па справах, на сталае месца работы. Да ўсяго астатняга, мы і ў Мінску можам выдаваць кнігі на англійскай і нават партугальскай мовах, якія, канешне ж, маглі б быць запатрабаваныя і ў Лісабоне.

***— Ігар Мікалаевіч, хто яшчэ, акрамя паліграфкамбіната імя Якуба Коласа, працуе на беларускім стэндзе на кірмашы ў Лісабоне?***

— Нашу краіну прадстаўляюць выдавецтвы «Народная асвета», «Мастацкая літаратура», «Пачатковая школа». Мае калегі і па выстаўцы, і па супрацы ў кнігавыдавецкай справе адкрываюць для сябе новы кніжны свет, бяруць на ўзбраенне той вопыт, які, зразумела, прыдасца ў Беларусі. Ці не павучыцца на тым кніжным кірмашы, дзе экспанентамі з'яўляюцца 328 суб'ектаў кніжнай, паліграфічнай справы? А наведвае Лісабонскі кірмаш звычайна каля 500 тысяч чалавек.

***— Што ж, поспехаў вам у знаёмстве з новымі прасторамі кніжнага свету!***

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**




## ХТО ТВОРЫЦЬ... ГІСТОРЫЮ

Некалі ў маладосці я, Зоя і Наташа жылі ў інтэрнаце, у адным пакоі. Потым, як вядзецца, стварылі сем'і, атрымалі кватэры. Я апынулася, можна сказаць, за светам, а вось Зоя з Наташай — па-ранейшаму побач, праз сценку, на адной лесвічнай пляцоўцы. Так што бачыліся яны па сем раз на дні (Зоя — чалавек бесцырымонны), а вось я...

У горад сваёй маладосці мне пашчасціла прыехаць праз дваццаць з лішкам гадоў.

...Сустрэла мяне Наташа (цягнік прыходзіў раніцай), прывезла да сябе дамоў. Я распакавала трохі рэчаў, змыла пад душам дарожны пыл, накруціла на галаву ручнік і, піхнуўшы дзверы з ваннага пакоя, тут жа... апынулася ў абдымках нейкай растрапанай істоты. Прычым (што вельмі здзівіла) тая не павіталася са мной (гэта было б хоць крыху зразумела) — яна адразу ж папрасіла: «Надзя, любка мая, будзь чалавекам — зрабі мне ўкладку».

«Якую? Чаму? Каму?» — на ўсе вочы я глядзела на жанчыну, якая тым часам і не думала змаўкаць: «Што — не пазнаеш? А ты прыгледзься! Мы ж з табою разам жылі. Помніш — дыван куплялі?»

Вось гэта і сапраўды наўрад ці забудзеш!

Такім чынам — час жорсткага дэфіцыту: чэргі, талоны, купоны, кніжкі спажыўцоў з лімітам на ўсё, нават на мыла, трусы і шкарпэткі...

Якраз тады — і проста да смерці! — Зоя захацела купіць дыван (!). «Гэта немагчыма!» — казалі ёй мы з Наташай. «А вось паглядзім!» — абяцала яна і з самымі рашучымі намерамі павезла нас у сталічны ГУМ, завяла ў патрэбны аддзел, а далей...

«Стойце тут, глядзіце і вучыцеся», — наказала нам Зоя і, трохі павагаўшыся ў выбары «ахвяры», падскочыла да самай важнай гандляркі, схапіла яе за рукаво і залапатала: «Любачка, родная, гэта ж колькі я цябе не бачыла?!»

Жанчына глядзіць на Зою і нічога не разумее, а тая ўсё гаворыць, гаворыць — пра бацьку, пра дзядзьку, пра нейкую цётку...

Рэдкі чалавек не мае падобнай радні. Вось і гандлярка, відаць, падумала, што Зоя — адна з нейкіх далёкіх сваячак, якая тым часам ужо і пра... дыван размову заводзіць.

Ну што тут будзеш рабіць — трэба ж дапамагаць свайму чалавеку. «Прыйдзіце ў шэсць гадзін вечара, — кажа жанчына. — Але ж каб з талонам на чаргу і кніжкай спажыўца».

У Зойкі — мы дакладна ведаем — нічога няма: грошай і тых хіба на прасціну.

Але ж не была б яна прайдзісветкай! На базары ў нейкага ветэрана купіла талон, у Наташы ўзяла кніжку спажыўца, грошы збірала па ўсім інтэрнаце: прасіла, маліла, казала, што чарга падышла, што талон прападае.

І што вы думаеце?! Спраўдзіла сваё жаданне: у той жа вечар (ні ста́ла, ні нават табурэткі ў кватэры яшчэ не было) «кінула» на падлогу дыван. Утраіх, як помню, мы наскрэблі яшчэ на бутэльку віна — пасядзелі на ім, выпілі, паспявалі, парагаталі.

...Пакуль я ўсё гэта ўспомніла, рукі нияк міжволі... зрабілі Зоі ўкладку, і тая з прыгожай прычоскай на новай машыне панеслася па нейкіх справах. У яе, як вы здагадаліся, свой бізнес, прычым вельмі паспяховы!

Цікавыя жанчыны твораць гісторыю.

**Надзея М.,**
*г. Пскоў.*

## ШТО ДОБРА КАРАСЮ...

Францавіч у нас — чалавек паважаны, бо ў мінулым, па-першае, ён адзін з найлепшых механізатараў-льнаводаў, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а па-другое, ветэрану за дзевяноста ўжо... Кажа, што куляй жыццё праляцела, ды згадвае, як некалі з вёсачкі Грыбова пераехаў у наша мястэчка, як пасяліўся на беразе ракі Дрыса. І, вядома ж, хадзіў на рыбалку, але некуды падалей. Гэта з часам, пастарэўшы, ён аблюбаваў сабе іншае месца — у канцы свайго агарода. Там жа для зручнасці лаўку паставіў.

Трэба сказаць, што зрабіў ён гэта не марна: рыба лавілася, прычым розная — і галаўні, і плоткі, і ляшчы. Асобныя з іх, як хваліўся Францавіч, за кілаграм «цягнулі»... І толькі ў адным не шчасціла дзеду: дно ў тым месцы было вельмі падкае на ягоныя рыбацкія снасці, гэта значыць — што ні рыбалка, то страты ў рыбака. І добра яшчэ, калі кручкі на нейкім карчы застануцца, а то ж, здаралася, і ўся лёска — з паплаўком ды грузам...

Па новыя Францавічу блізка схадзіць, але ж ён лічыў, што лепш запасціся. Хоць і псіхаваў...

Производственная база (одним лотом) в составе: **производственный корпус с АБК** (30438,2 кв. м, 500/С-42862, составные части: площадки (для складирования отходов, под склад готовой продукции, заготовок, металла с путями под козловой кран, под памятник) – 9 шт., дорожки (4 шт.), проезд, цветник, ограждение (10 шт.), ворота (5 шт.), калитка, **здание складов** (192,6 кв. м, 500/С-46903), **склад ООМиК** (59,4 кв. м, 500/С-53656), **механический цех №12** (2658,8 кв. м, 500/С-46879, навес), **теплопункт** (722,8 кв. м, 500/С-46881), **весовая** (8,6 кв. м, 500/С-62782, навес), **проходная** (9,2 кв. м, 500/С-53657), **зеленые насаждения** (деревья 44 шт., туи 15 шт., кустарники 209 шт.), цветники 34 кв. м, газоны и напочвенные покровы 5202 кв. м), **передаточные устройства** (линия э/снабжения цеха № 12 (инв. № 20003-2), освещение наружное 220В (инв. № 2007), канализация ливневая (инв. № 2024) и производственно-фекальная (инв. № 2023), водопровод (инв. № 2019, 2025), трубопровод сжатого воздуха внутри главного корпуса (инв. № 4311), теплотрасса (инв. № 22007, 22008, с дренаж. насос. станцией инв. № 22013), связь телеф. (инв. № 2008). Подробный перечень см. на сайте cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 % – 15 652 224,00 бел. руб.** (снижена на 30 %)

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве временного пользования пл. **5,2336 га (**срок действия по 31.07.2020). **Ограничения** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне

**Условие аукциона:** дальнейшее использование предмета аукциона должно осуществляться в соответствии с требованиями генерального плана г. Минска, утвержденного Указом Президента РБ от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», включающие дальнейшее использование земельного участка, на котором расположен предмет аукциона, под многофункциональную застройку по согласованию с Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома. Данные условия будут включены в договор купли-продажи.
В случае продажи имущества, площади предмета аукциона будут освобождены Продавцом до декабря 2020 года

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 25.04.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **31.07.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **29.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «МПЗ»

**Лот № 1:** 1. Здание службы механика, инв. № 500/С-55970, 1999 г. п. Площадь – 17,7 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/15.

2. Здание специализированное обрабатывающей промышленности, инв. № 500/С-39621, 1992 г. п. Площадь – 350,9 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/11.

**Начальная цена с НДС – 199 797,70 бел. руб.**
**Задаток – 20 000,00 бел. руб.**

Земельный участок: кадастровый номер 500000000002002072, площадь – 1,1882 га. Право временного пользования. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Лот № 2:** незавершенное законсервированное строение, инв. № 500/U-1026105. Площадь – 857,6 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7.

**Начальная цена с НДС – 1 520 146,80 бел. руб.**
**Задаток – 100 000,00 бел. руб.**

Земельный участок: кадастровый номер 500000000002008444, площадь – 36,8556 га. Право общей долевой аренды. Доля: 99/100. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by

**Условия аукциона**: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Лота (Лотов), согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 2,5 % от цены продажи Лота № 1, 0,75 % от цены продажи Лота № 2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 16.07.2019 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ОАО «МПЗ», г. Минск, ул. Жилуновича, д. 2, тел. 8 (017) 295-10-52. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8(017) 324-70-57. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота №__, проводимом **16.07.2019** г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **12.07.2019** в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Третьяков Максим Васильевич, тел. 8(033)-631-36-81

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03,**
**8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 11.07.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Акулевича Н. Р.

Легковой хэтчбек «Рено Меган Сценик, 1997 г. в., начальной стоимостью 1 840 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

В суд Березовского района Брестской области поступило заявление Щурко Елены Антоновны об объявлении умершим гражданина Щурко Василия Ивановича, 25 марта 1950 года рождения, уроженца д. Спорово Брестской области, последнее известное место жительства – Брестская обл., г. Белоозерск, пр-т Мира, д. 5, кв. 24.

Всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Щурко Василии Ивановиче, просьба сообщить их суду Березовского района Брестской области в течение двух месяцев с момента публикации.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Надыходзіць спрыяльны перыяд для таго, каб стаць сабой — перастаць падладжвацца пад іншых і адпавядаць чужым чаканням. Вы будзеце энергічныя, актыўныя, вынаходлівыя. Справы пойдуць лёгка, трэба будзе толькі накіроўваць сваю энергію ў патрэбнае рэчышча. У гэты час вам будзе лёгка падняцца па службовай лесвіцы, разбагацець, сустрэць людзей, якія змогуць аказаць неацэнную дапамогу і падтрымку.

**ЦЯЛЕЦ.** Рацыянальнасць і ўменне збалансаваць эмоцыі дазволяць раскрыць свой патэнцыял. Надыходзіць час перамен, наступіць шмат цікавых прапаноў па рабоце, толькі не варта спяшацца з прыняццем рашэнняў. У зносінах з калегамі сачыце за сваімі выказваннямі, пачуўшы крытыку, не спяшайцеся крыўдзіцца, а зрабіце правільныя высновы. У выхадныя набудзьце што-небудзь новае для дома, і вы ўбачыце, як ён зменіцца.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні вас чакае штосьці прыемнае, рамантычнае, эратычнае. Рыхтуйцеся да любоўнага спаткання і шчырых прызнанняў. Чацвер — удалы дзень для абдумвання наватарскіх ідэй, хоць для гэтага спатрэбіцца адзінота, а з ёй могуць узнікнуць праблемы. Вас могуць наведаць няпрошаныя госці, паспрабуйце праявіць шчодрасць і гасціннасць.

**РАК.** На гэтым тыдні для ажыццяўлення сваіх задум вы як ніколі маеце патрэбу ў надзейным партнёры. І ён будзе побач з вамі. Зоркі раяць раскрыць вочы і заўважыць блізкага па духу чалавека, які ўжо даўно знаходзіцца ў вашым акружэнні. У панядзелак і аўторак варта скарыстацца падказкамі інтуіцыі. Будзьце больш уважлівыя да намёкаў начальства.

**ЛЕЎ.** Вы схільныя праяўляць паблажлівасць да ўласных недахопаў і пры гэтым любіце крытыкаваць іншых. Не пераступіце мяжу, інакш ваш аўтарытэт можа пахіснуцца. У аўторак не паддавайцеся на правакацыі, бо вас захочуць выкарыстаць, уцягваючы ў канфліктную сітуацыю. Серада — удалы час для пабудовы планаў на будучыню. Выхадныя варта правесці за горадам.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні, абраўшы прыярытэтны кірунак, не зварочвайце са шляху, інакш усе намаганні пойдуць прахам. Неабходна праявіць дзелавы падыход, не спазняцца і не апраўдвацца. У панядзелак і аўторак не варта захапляцца барацьбой з навакольнымі: перш чым пачынаць кусацца, далічыце да дзесяці, а лепш — да ста. У чацвер з'явіцца выдатны шанц паспяхова злучыць ідэі з практыкай, а мары ўвасобіць у рэальнасць. Да выхадных пазіцыі, якія вас задавальняюць, будуць адваяваны, і вы адчуеце сябе гаспадаром становішча.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вы адчуеце ўсю ўладу свайго абаяння, а ўвага да меркавання навакольных толькі ўмацуе ваша ўласнае становішча. Ваша арыгінальная прапанова ў панядзелак можа здацца калегам па рабоце рызыкоўнай, але толькі яна зможа выратаваць сітуацыю. У чацвер і пятніцу непажадана браць на сябе рашэнне чужых праблем.

**СКАРПІЁН.** Практычна ўсё, што вы плануеце на тыдзень, ажыццявіцца і прынясе поспех. Спатрэбіцца рашучасць, актыўнасць, уменне хутка рэагаваць на сітуацыю. Начальства ацэніць вашы ідэі і, цалкам верагодна, зробіць прапанову аб павышэнні. Сустрэчы з сябрамі, любоўныя спатканні, абмен уражаннямі і новымі ідэямі напоўняць жыццё радасцю.

**СТРАЛЕЦ.** У найбліжэйшыя дні вы пры жаданні можаце пачаць чарговы этап свайго развіцця, таму смела можна брацца за новыя справы. Ваша ініцыятыва абяцае набыць цалкам матэрыяльныя абрысы. Не хвалюйцеся, удача зараз на вашым баку. У чацвер на даляглядзе жыцця можа з'явіцца чалавек, з якім не хацелася б сустракацца яшчэ раз, але менавіта ад яго прыйдзе дапамога, у якой вы так маеце патрэбу.

**КАЗЯРОГ.** Рэкамендуецца актыўнасць і настойлівасць у рэалізацыі планаў. З'явіцца магчымасць кар'ернага росту, асабліва калі вы выявіце такія якасці, як працавітасць і спакой, дзейнічаючы без залішняй мітуслівасці, каб не спудзіць поспех. У сераду могуць парадаваць доўгачаканыя навіны.

**ВАДАЛІЎ.** У аўторак нарэшце з'явіцца шанц узяцца за ажыццяўленне даўно задуманага. Серада можа быць азмрочана дробнымі непрыемнасцямі, але яны вельмі хутка забудуцца. Аднак чакаецца не зусім прыемная размова з начальнікам, якая скончыцца канкрэтным рашэннем, невядома толькі, вашым ці начальніка. Але не варта асабліва трывожыцца, зоркі не пакінуць вас без заступніцтва.

**РЫБЫ.** Добрая пара, каб пачаць адпачынак менавіта цяпер. Падарожжы прынясуць разнастайныя ўражанні і новыя знаёмствы. Калі ж вы пакуль толькі марыце пра далёкія краіны, на рабоце магчымая вельмі далікатная сітуацыя, якая паставіць вас у цяжкае становішча. Пажадана не канфліктаваць з начальствам. Пятніца — адзін з самых удалых дзён тыдня, паспяховымі будуць пытанні прасоўвання па кар'ернай лесвіцы.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.43 | 17.06 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.41 | 17.23 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.33 | 17.06 |
| Гомель — | 4.33 | 21.20 | 16.47 |
| Гродна — | 4.54 | 21.56 | 17.02 |
| Брэст — | 5.04 | 21.47 | 16.43 |

**Месяц**

*Першая квадра 10 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

*Пр. Веры, Валяр'яна, Дзяніса, Харытона, Усціна.*
*К. Элізы, Эльвіры, Юстыны, Базыля, Валерыя, Міхала.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 14 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

**1894** год — нарадзіўся (Украіна) Ян Барысавіч Гамарнік, савецкі партыйны і ваенны дзеяч, армейскі камісар 1-га рангу (1935). У 1918—1920 гадах на партыйнай і савецкай рабоце ва Украіне, з 1923 года — на Далёкім Усходзе. У 1928—1929 гадах першы сакратар ЦК і член бюро ЦК КП(б) Беларусі, член РВС Беларускай ваеннай акругі. З 1930 года намеснік наркама абароны і намеснік старшыні РВС СССР. У перыяд рэпрэсій у 1937 годзе абвінавачаны як «вораг народа», скончыў жыццё самагубствам. Рэабілітаваны ў 1955-м. Яго імем названа вуліца ў Мінску.



**1939** год — нарадзіўся (г. Камсамольск-на-Амуры) Арнольд Кандратавіч Памазан, беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. У 1967 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Выканаўца вострахарактарных і камедыйных роляў. Сярод найлепшых роляў у беларускім рэпертуары: Адольф Быкоўскі («Паўлінка» Я. Купалы), Чарнавус («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Андрэй Буслай («Парог» А. Дударава) і іншыя. Зняўся ў беларускіх кіна- і тэлефільмах «Я, Францыск Скарына», «Час выбраў нас», «Хам».

**1954** год — нарадзіўся (Расія) Юрый Анатолевіч Курненін, вядомы беларускі футбаліст і трэнер. Чэмпіён СССР (1982), бронзавы прызёр (1983). Фіналіст Кубка СССР (1987). У 2006—2009 гадах галоўны трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі па футболе. Памёр у 2009 годзе.

У свеце

*Сусветны дзень донара крыві. Адзначаецца з 2004 года ў дзень нараджэння Карла Ландштэйнера (1868—1943), аўстрыйскага вучонага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне (1930), які адкрыў групы крыві чалавека (1900).*

**1905** год — на браняносцы «Князь Пацёмкін Таўрычаскі» Чарнаморскага флоту адбылося першае масавае антыўрадавае выступленне ў імператарскай арміі Расіі падчас рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. У ходзе стыхійнага ўзброенага выступлення, якое пачалося з-за няякаснай ежы, матросы захапілі карабель у свае рукі, забіўшы пры гэтым некалькі афіцэраў. Не маючы дакладнага плана далейшых дзеянняў, паўстанцы павялі карабель у Адэсу, дзе мелі намер папоўніць запасы вугалю, вады і харчавання, падтрымаць антыўрадавыя выступленні, якія праходзілі ў горадзе, і сустрэцца з галоўнымі сіламі Чарнаморскага флоту, якія, як меркавалі ўдзельнікі выступлення, далучацца да паўстання. Пасля таго як планы і надзеі паўстанцаў не апраўдаліся, бранясосец, здзейсніўшы паход ад Канстанцы да Феадосіі і назад, праз адзінаццаць дзён здаўся румынскім уладам у порце Канстанца.

**1985** год — пяццю краінамі ЕС (Францыяй, Бельгіяй, ФРГ, Люксембургам і Нідэрландамі) падпісана Пагадненне аб адмене візавага кантролю на ўнутраных межах. Па месцы яго падпісання ў горадзе Шэнген (Люксембург) носіць назву Шэнгенскае пагадненне.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Доктар, у мяне жывот баліць.**
**— А што вы ўчора елі?**
**— Голуба еў.**
**— А вы голага голуба елі?**
**— Так, злавіў, абскуб і голага голуба з'еў.**
**— А вы галаву голуба елі?**
**— Так, галаву голуба еў.**
**— А вы голую галаву голуба елі?**
**— Ну, так, голую галаву голуба еў. А што?**
**— Нічога. Проста я лагапед, чым змог — дапамог.**

Я думаў, што пасля вяселля ў нас з жонкай будзе больш грошай, таму што будзе дзве крыніцы даходу.

Так і выйшла — я ўладкаваўся на другую работу...




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1989.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 13 чэрвеня 2019 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

14 чэрвеня 2019 г. № 24 (509)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



УВАГА!

Адкрыта асобная падпіска на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).

Для юрыдычных асоб — 63307

Для фізічных асоб — 633072

Аформіць падпіску можна на тэрмін ад аднаго месяца да паўгода.


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота БелТА.

# ФУНДАМЕНТ ДОБРАСУСЕДСТВА

## Беларусь—Польшча: агульная мяжа, агульныя праекты

**БЕЛАРУСЬ і Польшча дамовіліся аб распрацоўцы новых праграм супрацоўніцтва на 2021—2027 гады. Адбылося гэта падчас XXII Беларуска-польскага эканамічнага форуму «Добрасуседства-2019». Сёлета ў мерапрыемстве ўдзельнічала больш за 440 прадпрымальнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі і 140 польскіх бізнесменаў. Яны прадстаўлялі разнастайныя сферы — сельскую гаспадарку, навуку, адукацыю, ІТ. Асаблівы статус падзеі надаў удзел старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла МЯСНІКОВІЧА і яго польскага калегі, маршала Сената Польшчы Станіслава КАРЧЭЎСКАГА, прадстаўнікоў кіраўніцтва міністэрстваў і дыпламатычных місій дзвюх краін.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 2—3

ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА

# ДА ЎСЯГО ТРЭБА ПАДЫХОДЗІЦЬ ТВОРЧА...

## Так лічыць дэпутатка, якая каардынуе дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў у Магілёве



**ГАЛІНА БЯЛЯЕВА — чалавек справы. Калі яна за нешта бярэцца, то робіць гэта самааддана і з імпэтам. У жыцці яна сумяшчае працу намесніка дырэктара школы № 34 Магілёва з дзейнасцю дэпутата гарсавета, члена рэспубліканскага савета аб'яднання «Белая Русь», а таксама ўзначальвае каардынацыйны Савет грамадскіх і нацыянальных аб'яднанняў, палітычных партый і прафсаюзных арганізацый Магілёва. Галіна Бяляева прызнаецца, што апошняя справа дапамагла ёй адкрыць шмат новага і цікавага. Яна лічыць, што магчымасці грамадскіх аб'яднанняў нельга пераацаніць, у іх вельмі вялікі патэнцыял, бо на чале іх стаяць сапраўдныя актывісты.**

### Быць з усімі на сувязі

— Раней я ведала, што ў горадзе існуе шмат розных грамадскіх арганізацый, але глыбока ў гэта не ўнікала, — расказвае яна. — Насамрэч, тут усё вельмі сур'ёзна. Людзі аб'ядноўваюцца на глебе сваіх інтарэсаў, і не проста так, а пішуць статут, рэгіструюцца. У каардынацыйны савет, дарэчы, уваходзіць 66 аб'яднанняў. Мая справа — забяспечваць іх сувязь паміж сабой і з рознымі органамі ўлады. Наш каардынацыйны савет адкрыты для ўсіх, хто жадае рабіць нейкую сумесную работу, падзяліцца вопытам або чамусьці навучыцца. Калі я прыйшла на гэтую пасаду, стала аналізаваць дзейнасць грамадстваў. І прыйшла да высновы, што яны не ўмеюць сябе папулярызаваць. На сайце былі прадстаўлены толькі нацыянальныя аб'яднанні — і я ўключыла ўсе астатнія.

стар. 15

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Шляхам Тызенгаўза



У Гродне з'явіцца гарадская ратуша, ад якой пачнецца міжнародны турыстычны маршрут. стар. 4,13

### «Рухомая» нерухомасць



Дэпутаты Віцебскага аблсавета пазнаёміліся з вопытам Глыбоччыны па ўцягванні ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўваемых будынкаў. стар. 14

### Сяброуем рэгіёнамі



Тэма супрацоўніцтва Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў і Заканадаўчага сходу Краснадарскага края абмяркоўвалася ў Сочы. стар. 14

### Конкурс бізнес-ідэй



абвясцілі ў Оршы і яшчэ 11 раёнах, што ўвайшлі ў лік пілотных па рэалізацыі праекта «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні». стар. 16

УЗНАГАРОДА

## За развіццё мясцовага самакіравання

**Спікер верхняй палаты парламента Міхаіл Мясніковіч на нядаўнім пасяджэнні шостай сесіі ўручыў старшыні Віцебскага абласавета дэпутату Уладзіміру Цярэнцьеву Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за заслугі ў развіцці мясцовага самакіравання і вялікі ўнёсак у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі краіны.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Рэдакцыя «МС» шчыра віншуе яго з гэтай узнагародай і жадае яшчэ больш плённай працы. Заўсёды цікава знаёміць чытачоў з перадавым вопытам і дасягненнямі. І добра, што на Віцебшчыне часта ёсць інфармацыйныя нагоды для падрыхтоўкі рэпартажаў і артыкулаў пра дзейнасць прадстаўнічай улады.

ФОРУМ

# НА ШЛЯХУ «ЗЯЛЁНАГА» РОСТУ

**НАМЕСНІК старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА на мінулым тыдні ўзяла ўдзел у адкрыцці XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму, які прайшоў у Навагрудку, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.**

Найважнейшымі прыярытэтамі дзяржаўнай экалагічнай палітыкі з'яўляюцца эфектыўнасць выкарыстання прыродных рэсурсаў і захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя, адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Беларусь актыўна прасоўваецца па шляху «зялёнага» росту, развіцця новых экалагабяспечных галін. Прыкладам у сферы ўстойлівага развіцця малых гарадоў па праве можна назваць Навагрудак, які ў 2017 годзе стаў пілотным горадам праекта «Зялёныя гарады» і ўжо сёння з'яўляецца добрай базай для абмену вопытам.

«На першым Нацыянальным форуме па ўстойлівым развіцці, які адбыўся ў студзені ў Мінску, было адзначана, што фокус успрымання насельніцтвам нашай краіны «зялёнай» эканомікі змяніўся з агульных паняццяў «прырода», «навакольнае асяроддзе» на паняцці «мадэрнізацыя», «эканоміка», «дабрабыт», «пераход да безадходнай вытворчасці», «павышэнне асабістага ўдзелу жыхароў у пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, выторчасці і спажывання эка-прадуктаў». Пры гэтым па-ранейшаму існуе праблема чалавечага фактару — забруджванне глебы і вады бытавымі адходамі, нежаданне паасобнага збору смецця», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Значыць, патрабуе ўдасканалення сістэма экалагічнай адукацыі і асветы. Экалагічны складнік павінен быць ва ўсіх адукацыйных, галіновых і рэгіянальных праграмах, падкрэсліла яна. Пераход да безадходнай вытворчасці, далейшае ўдасканаленне работы па асобным зборы смецця і яго перапрацоўцы, стымуляванне выкарыстання шматразовых тавараў, выхаванне беражлівых адносін да прыроды, азеляненне тэрыторый — тыя драйверы, якія будуць закладваць асновы экалагічнай устойлівасці.

Нацыянальны каардынатар таксама адзначыла неабходнасць падтрымліваць стварэнне і функцыянаванне рэгіянальных і мясцовых прыватных і прыватна-дзяржаўных структур, дзейнасць якіх накіравана на тэрытарыяльнае развіццё. «Важна ўкараняць новыя падыходы і шукаць новыя крыніцы фінансавання ўстойлівага развіцця. Такім напрамкам можа стаць «імпакт-інвеставанне», калі прыватныя кампаніі рэалізуюць камерцыйныя праекты, накіраваныя на вырашэнне сацыяльных і экалагічных праблем», — удакладніла яна.

Мар'яна Шчоткіна выказала ўпэўненасць у тым, што форум дасць магчымасць выпрацаваць новыя падыходы ў вырашэнні пытанняў экалагічнай бяспекі і надасць імпульс сумеснай працы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

# ФУНДАМЕНТ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

«Для Беларусі Польшча — важны і перспектыўны партнёр у Еўрапейскім саюзе. Паміж нашымі краінамі актывізаваўся палітычны дыялог, міжпарламенцкія, міжурадавыя кантакты набылі сістэмны характар, умацоўваецца гандлёва-эканамічныя сувязі. Гэта, у сваю чаргу, — добры знак і спрыяльныя ўмовы для бізнес-супольнасці. Па выніках 2018 года ўпершыню за апошнія восем гадоў аб'ём узаемнага гандлю дасягнуў 2,55 мільярда долараў ЗША. У Беларусі працуе 339 арганізацый з польскім капіталам. Польскія інвестыцыі ў эканоміку Беларусі за мінулы год склалі 445 мільёнаў долараў ЗША», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч.

Польшча займае шостае месца сярод знешнегандлёвых партнёраў Беларусі. Агульныя намаганні перспектыўныя ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». «У гэтых пытаннях нашы краіны зрабілі нямала важных крокаў насустрач. Напрыклад, нядаўна заключаны Дагавор аб утрыманні пагранічных чыгуначных маставых аб'ектаў на беларуска-польскай мяжы, актывізаваліся праекты па аўтамабільных дарогах», — сказаў старшыня Савета Рэспублікі.

Асаблівая ўвага аддаецца інавацыйным, навукова-тэхнічным, трансгранічным, інфраструктурным праектам. Таксама цікавым уяўляецца ўзаемадзеянне ў сферы клетачнай інжынерыі, аховы экасістэм Белавежскай пушчы.

Беларусь і Польшча прэтэндуюць на статус еўрапейскіх лідараў у сферы інавацый. У Польшчы сфарміравана развітая сістэма тэхнапаркаў і інкубатараў, створаны польскі фонд развіцця, дзейнічае праграма па спрашчэнні прадпрымальніцкай дзейнасці «Канстытуцыя для бізнесу». У Беларусі меры па падтрымцы бізнесу, развіцці прыватнай ініцыятывы і IT-індустрыі знайшлі ўвасабленне ў дэкрэтах Прэзідэнта (№ 7 і № 8). Таму лічбавізацыя і IT-тэхналогіі — новыя кірункі супрацоўніцтва для краін.

Па словах кіраўніка верхняй палаты парламента, Беларусь — краіна з адкрытай эканомікай, зацікаўленая ў прыцягненні польскіх інвестараў, і не толькі сусветна вядомых. Многія праекты Міхаіл Мясніковіч абмяркоўваў з міністрам прадпрымальніцтва і тэхналогій Польшчы Ядзвігай Эмілевіч падчас візіту ў гэтую дзяржаву ў лютым гэтага года.

Актыўны ўдзел у форуме прымалі і маладыя людзі як на пляцоўках секцый, так і сярод арганізатараў. Найлепшыя іх ініцыятывы неабходна падтрымліваць на ўзроўні стартапаў, каб у будучыні яны перараслі ў бізнес. «За маладзёжнымі кантактамі будучыня нашага супрацоўніцтва. У той жа час гэта ўзаемадзеянне павінна ажыццяўляцца на адкрытай, парытэтнай аснове, не перарастаць у вымыванне кадраў», — заўважыў Міхаіл Мясніковіч.

Падчас размовы з журналістамі старшыня Савета Рэспублікі акцэнтаваў увагу на навінках форуму, які адбыўся ўжо дваццаць другі раз: «Ён прырос не толькі колькасцю ўдзельнікаў, але і сваёй тэматыкай».

Міхаіл Мясніковіч паведаміў пра праграмы партнёрства, аб якіх дамовіліся сенатары: «Нашы праграмы, у тым ліку трансгранічнага супрацоўніцтва, супрацоўніцтва ў рамках рэгіёнаў Буг — Нёман, заканчваюцца 2020-м годам. Гэта праграмы фактычна Еўрасаюза, Беларусі і Украіны. І мы дамовіліся аб тым, што ўжо сёлета приступім да падрыхтоўкі новай праграмы пасля 2021 года. Мы лічым, што разліковы перыяд — 2021—2027 гады».

Па прычыне больш цесных кантактаў з ЕС у апошнія часы ёсць надзея, што новыя дамоўленасці будуць больш плённыя, чым папярэднія. Акрамя гэтага, Беларусь і Польшча распрацуюць двухбаковую праграму, якая вырашыць пытанні не толькі трансгранічных, але і камерцыйных, адукацыйных праектаў.

Станіслаў Карчэўскі паведаміў пра развіццё навуковага супрацоўніцтва



# Аўтацыстэрна для пушчы, музей,

## Брэсцкія ратавальнікі рэгулярна атрымліваюць

**КАЛЯ дзесяці гадоў брэсцкія ратавальнікі ўдзельнічаюць у якасці заяўнікаў або партнёраў у праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча—Беларусь—Украіна». Гэта дае добрыя магчымасці для далейшага развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы і ўкаранення перадавых тэхналогій.**

Любому турысту ў нас скажуць, што на Брэстчыне захавалася нямала мясцін, якія амаль не кранула цывілізацыя: густыя лясы Белавежскай пушчы, забалочаныя поймы Прыпяці і Піны, іншыя прыродныя славутасці. Яныназапашвалі свой прыродны патэнцыял многія стагоддзі, а знішчаны могуць быць за лічаныя гадзіны. Бо пажары на тарфяніках, у лясах, нярэдка справакаваныя неабачлівасцю чалавека, — шматгадовая праблема ў памежных рэгіёнах Беларусі, Украіны, Польшчы. Маючы пачатак на тэрыторыі адной з краін, пажар пагражае суседнім. Брэсцкія ратавальнікі ў свой час прапанавалі комплексны падыход у вырашэнні гэтай праблемы. Для захавання ўнікальнай прыроднай разнастайнасці і абароны насельніцтва ад наступстваў пажараў у экасістэмах узнікла неабходнасць у кааперацыі паміж мясцовымі ўладамі, пажарна-выратавальнымі службамі, грамадскімі арганізацыямі трох краін. Так з'явіліся сумесныя праекты «Захаваем Белавежскую пушчу разам», «Развіццё трансгранічнага супрацоўніцтва для абароны людзей і навакольнага асяроддзя на памежнай тэрыторыі Польшчы і Беларусі» ды іншыя.

У праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча—Беларусь—Украіна» выратавальнікі ўпершыню прынялі ўдзел некалькі гадоў таму. Іх праект называўся «Удасканаленне сістэмы грамадскага ўдзелу ў папярэджанні і ліквідацыі экалагічных катастроф у еўрарэгіёне «Буг». Мэтай праекта вызначалася пераламаць сітуацыю з вясновымі паламі травы. Тады ў вобласці сітуацыя была больш чым напружанай, баявыя разлікі пастаянна выязджалі на тушэнне палаючай раслліннасці. Акрамя таго, востра стаяла праблема дзіцячага свавольства з агнём. Выдзеленыя сродкі ў памеры аднаго мільёна еўра дазволілі пабудаваць у абласным цэнтры міжнародны валанцёрскі цэнтр выратавальнікаў з канферэнц-залай, гасцініцай, вучэбна-трэніровачнай базай, выдаць цэлы шэраг найменняў папулярнай літаратуры.

Адной з самых значных сумесных спраў выратавальнікі называюць праект «Захаваем Белавежскую пушчу разам». Тады за мільён еўра ўдалося набыць 30 адзінак тэхнікі, у тым ліку чатыры дзесяцітонныя цыстэрны з поўным наборам абсталявання. Гэты праект прызнаны адным з найлепшых у сферы бяспекі. На ўрачыстае падвядзенне вынікаў праекта прыехалі калегі брэсцкіх выратавальнікаў з Польшчы. Разам залажылі алею сяброўства з маладых дубкоў.

Супрацоўніцтва з суседзямі і Еўрасаюзам працягваецца. Удзел у кожным чарговым этапе праграмы дазволіў за кошт грантавых сродкаў набыць тэхніку павышанай праходнасці для тушэння тарфянікаў,

# ДОБРАСУСЕДСТВА



> «По выніках 2018 года ўпершыню за апошнія восем гадоў аб'ём узаемнага гандлю дасягнуў 2,55 мільярда долараў ЗША. У Беларусі працуе 339 арганізацый з польскім капіталам. Польскія інвестыцыі ў эканоміку Беларусі за мінулы год склалі 445 мільёнаў долараў ЗША».

У рамках форума таксама праходзяць сустрэчы вучоных, прадстаўнікоў універсітэтаў дзвюх краін, пройдуць перамовы бізнесу, якія несумненна прынясуць і новыя пагадненні, і новыя кантракты», — сказаў на адкрыцці **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ.**

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Уладзімір КАЛТОВІЧ** адзначыў, што за лічбамі тавараабароту, інвестыцый схавана галоўнае — гісторыя адносін нашых народаў: «Фундамент сумеснага жыцця фарміруе такі неабходны сёння фундамент партнёрскіх і, галоўнае, мірных адносін».

Міністр расказаў пра магчымасці для замежных прадпрымальнікаў у нашай краіне. «У Беларусі адчынены дзверы для польскага бізнесу, створаны ўсе неабходныя ўмовы для прыбытковай работы, створана сістэма стымулявання і абароны інвестараў. Існуе шэраг спецыяльных прэферэнцыяльных рэжымаў для ўсіх сфер — ад прамысловасці да высокіх тэхналогій, — сказаў Уладзімір Калтовіч. — Я хачу запэўніць польскі бізнес, што нязначныя інвестыцыйныя рызыкі з лішкам будуць перакрывацца гарантаваным доступам да сыравіны, высокаадукаванай, прафесійнай рабочай сілай, а таксама выхадам на шматмільённы рынак еўразійскай эканамічнай прасторы».

**Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛА** паведаміў, што па выніках чатырох месяцаў бягучага года экспарт беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання ў Польшчу павялічыўся амаль у два разы ў параўнанні з мінулым. Пры гэтым расце і імпарт.

Падчас цырымоніі адкрыцця былі падпісаны двухбаковыя пагадненні прадпрыемстваў, устаноў аб супрацоўніцтве і ўручаны эканамічныя ўзнагароды імя Юзафа Лахоўскага за значны ўнёсак у развіццё адносін паміж прадпрымальнікамі Беларусі і Польшчы. З беларускага боку яе атрымала прадпрыемства «Санта-Брэмар», з польскага — будаўнічая кампанія Unibep.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота БелТА.**



паміж акадэміямі навук і ўніверсітэтамі Беларусі і Польшчы. «Я абсалютна згодны, што наш асноўны прыярытэт — гэта моладзь. Я таксама асабліва рады таму, што наш тавараабарот, інвестыцыі пастаянна растуць, але тым не менш абсалютна прыярытэтным застаецца чалавечае вымярэнне», — канстатаваў маршал Сената Польшчы.

Арганізавала чарговы форум Беларуская гандлёва-прамысловая палата сумесна з Польска-беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Польскім агенцтвам інвестыцый і гандлю. Падтрымала мерапрыемства Пасольства Польшчы ў Беларусі.

«Яго ўдзельнікам прапанавана шырокая праграма, якая ўключае дзелавое абмеркаванне пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і развіцця лагістыкі, інфармацыйных тэхналогій і іншага.

# БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

**Пытанні беларуска-польскага ўзаемадзеяння падчас форуму «Добрасуседства-2019» абмяркоўвалі на трох секцыях: «Стварэнне спрыяльнага клімату. Лагістычныя паслугі», «Інфармацыйныя тэхналогіі», «Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва і развіццё». Карэспандэнт «МС» наведала апошнюю і даведалася, якія перспектывы ёсць у партнёрства прыгранічных абласцей Беларусі і Польшчы.**

Брэсцкая вобласць сярод польскіх рэгіёнаў мае найбольш трывалыя кантакты з Падляскім і Люблінскім ваяводствамі. Плёну гэтаму партнёрству дадае факт, што рэгіёны — ключавыя звёны на новым Шаўковым шляху. Таму, на думку **Андрэя КЛЕЦА, намесніка старшыні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта,** узаемадзеянне краін у лагістычнай сферы паспрыяе развіццю выгаднай для ўсіх бакоў ініцыятывы.

Актуальнасць у гэтай сувязі набывае мадэрнізацыя і адкрыццё новых пагранічных пераходаў. Брэст ужо два гады выступае з ініцыятывай стварэння чыгуначнага перахода з Падляскім ваяводствам і рэканструкцыі некаторых аўтамабільных пераходаў.

Па словах Андрэя Клеца, вялікую ролю адыгрываюць і трансгранічныя праграмы. Напрыклад, праект «Польшча — Беларусь — Украіна», трэці этап якога завяршаецца ў хуткім часе, плануюць пашырыць фінансава і тэматычна. Найбольш паспяховыя ў рамках праграмы мерапрыемствы — паміж пажарнымі службамі і органамі МНС. Яны ўключалі сумесныя вучэнні, дапамогу ў надзвычайных абставінах, асветніцкую работу сярод дзяцей, падлеткаў, на небяспечных прадпрыемствах.

Сярод трансгранічнага ўзаемадзеяння зарэкамендавала сябе і дзейнасць па ўдасканаленні інфраструктуры — дарожнае будаўніцтва і развіццё камунальных службаў. Актыўнае партнёрства рэгіёнаў развіваецца ў сферы аховы здароўя. «Шмат праектаў прыцягнулі ўвагу да грамадзян з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, сур'ёзнымі праблемамі са здароўем. І гэтая ўвага, і праекты далі свой станоўчы вынік не толькі ў тэхнічным забеспячэнні нашых медыцынскіх устаноў, але і ў самой арганізацыйнай форме работы з асобамі, якія маюць фізічныя абмежаванні», — паведаміў намеснік старшыні аблвыканкама.

Дзейнасць па падтрымцы нацыянальных меншасцяў Брэсцкая вобласць ажыццяўляе сумесна з Падляскім ваяводствам. Прадстаўнікі гэтых супольнасцяў маюць магчымасць камунікаваць на нацыянальных мовах, праводзіць культурныя мерапрыемствы, накіраваныя на падтрымку сваіх традыцый, і атрымліваць адукацыю на роднай мове. «У Брэсцкай вобласці ёсць 25 навучальных устаноў (сярэдніх, сярэдніх спецыяльных, школьных), дзе сёння вывучаецца польская мова. А ў сярэдняй школе № 9 у Брэсцкай вобласці сёння да чацвёртага класа навучанне па ўсіх прадметах ідзе на польскай мове ў тых групах, дзе набіраюцца ахвотныя», — расказаў Андрэй Клец.

У сваю чаргу, **намеснік маршала Падляскага ваяводства Марэк ОЛЬБРЫСЬ** адзначыў: «Перадусім наша супрацоўніцтва базуецца на будаўніцтве дарог, а таксама на фармуляванні прынцыпаў пабудовы супрацоўніцтва па трансгранічным культурным, прыродным узаемадзеянні, выкарыстанні выдатных ландшафтных раёнаў нашага ваяводства, а таксама Гродзенскай і Брэсцкай абласцей».

Граніца, на яго думку, павінна не раздзяляць, а аб'ядноўваць людзей, якія жывуць побач. Так, Марэк Ольбрысь ухваліў ідэю бязвізавага доступу да Аўгустоўскага канала і ў Брэсцкі рэгіён.

**Генеральны дырэктар «Брэсцкага аддзялення БелГПП» Валерый ЛАБУН** адзначыў, што жыхары суседняй краіны не знаёмыя з магчымасцямі «бязвізу», таму нядаўна ўстанова правяла шэраг мерапрыемстваў з польскімі партнёрамі па інфармаванні грамадзян.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# вучэбны цэнтр

## гранты ад Еўрасаюза

а таксама адпрацаваць з польскімі і ўкраінскімі калегамі алгарытм ліквідацыі надзвычайных сітуацый на пагранічнай тэрыторыі.

— Вялікая ўвага на гэтым шляху аддаецца рабоце з дзецьмі і моладдзю, — расказаў **начальнік Цэнтра прапаганды бяспекі жыццядзейнасці Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Мікалай КУЗЬМІЦКІ.** — Па праграме «Моладзь памежжа разам за бяспеку» з бюджэтам у паўмільёна еўра ў адным з падраздзяленняў МНС па вуліцы Савецкай Канстытуцыі была створана музейная экспазіцыя пажарнай службы Брэстчыны з інтэрактыўнымі элементамі.

— Зараз дзякуючы праграме пачынаецца рэканструкцыя былой армейскай казармы па вуліцы Лейтэнанта Рабцава. Тут будзе абласны цэнтр бяспекі, абсталяваны з выкарыстаннем сучасных тэхналогій, — працягвае Мікалай Кузьміцкі. — Найноўшыя тэхналогіі паслужаць стварэнню тэматычных інтэрактыўных зон, дзе дарослыя разам з дзецьмі ў гульнявой форме змогуць прайсці навучанне. Яны атрымаюць як тэарэтычныя веды, так і практычныя навыкі. Праекціроўшчыкі прадугледзелі зоны не толькі па лініі МНС, але і па ўсіх аспектах бяспекі. Распрацоўшчыкі ідэі спадзяюцца, што ў выхадныя людзі будуць хадзіць сюды сем'ямі, нібы ў аквапарк. У новым цэнтры прадугледжана таксама база для навучання і ўдасканалення навыкаў супрацоўнікаў МНС пры выкарыстанні віртуальнай рэальнасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Кожнаму па тры масты

**Амаль год таму ў Брэсце кіраўнікі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі і Міністэрства інфраструктуры Польшчы падпісалі міжурадавае пагадненне аб утрыманні пагранічных дарожных маставых аб'ектаў на беларуска-польскай дзяржаўнай граніцы. Дадзенае пагадненне заменіць дагавор, які быў заключаны яшчэ ў 1993 годзе. Праект Закона аб ратыфікацыі гэтага пагаднення быў адобраны на нядаўняй сесіі ў Савеце Рэспублікі.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Самыя складаныя аб'екты дарожнай інфраструктуры — масты і пуцеправоды, — адзначыў **намеснік міністра транспарту і камунікацый Андрэй ІВАНОЎ.** — У нашым выпадку яны да таго ж знаходзяцца ў пагранічнай паласе. Але ад іх функцыянавання напрост залежаць сувязі паміж дзвюма краінамі. Дарожныя службы скіраваны на якаснае ўтрыманне мастоў і пуцеправодаў і ліквідоўваюць праблемы, якія ўзнікаюць, у самы кароткі час. Але з абодвух бакоў работы на мастах праводзяцца ў розны час, што негатыўна ўплывае на хуткасць і бяспеку дарожнага руху. Новае пагадненне павінна вырашыць гэтую праблему. Пасля яго ратыфікацыі на беларуска-польскай дзяржаўнай граніцы абодва бакі будуць утрымліваць па тры масты.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Суседзі, якія сябруюць праз мяжу

## Аб тым, як супрацоўнічаюць Беларусь і Польшча

**ГЭТА было яскрава прадэманстравана падчас круглага стала, які прайшоў у рамках чарговага XXII Беларуска-польскага эканамічнага форуму «Добрасуседства-2019». Прадстаўнікі Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, Падляскага і Люблінскага ваяводстваў расказалі, якія трансгранічныя праекты яны ажыццявілі і што плануецца на найбліжэйшы час. Пра важнасць форуму сведчыць і яго высокае прадстаўніцтва. У пасяджэнні прыняў удзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч і яго польскі калега — кіраўнік польскага Сената Станіслаў Карчэўскі.**

### ПРАЕКТЫ З САЛІДНЫМІ ГРАНТАМІ

Адным з інструментаў супрацоўніцтва сталі трансгранічныя праграмы «Добрасуседства» і «Польшча — Беларусь — Украіна». Краіны-суседкі на ўзроўні рэгіёнаў дамаўляюцца паміж сабой, каб выступіць з аднатыпнымі праектамі. Свае прапановы адпраўляюць на разгляд камісіі ЕС, і калі ўсё будзе адобрана, кожны бок атрымае сродкі на рэалізацыю.

Як расказала **выканаўчы дырэктар Цэнтра міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС у Беларусі Дзіна ГАНЧАРОВА,** такое супрацоўніцтва пачалося 15 гадоў таму. За гэты час было рэалізавана звыш 40 праектаў на суму 34 мільёны рублёў. Абодва бакі ўпэўніліся, што сумесная работа мае вялікі патэнцыял, бо спрыяе вырашэнню важных сацыяльных, эканамічных і культурных пытанняў жыцця. Бюджэт праграмы павялічваецца. Напрыклад, зараз ён складае 113 мільёнаў еўра.

Цяпер ідзе рэалізацыя праграмы «Польшча — Беларусь — Украіна» на 2017—2020 гады. Прайшлі два конкурсы. Па выніках першага было абрана 65 праектаў, палова — з удзелам беларускіх арганізацый, на долю якіх прыпадае 22,5 мільёна еўра. Найбольшая колькасць грантаў рэалізуецца ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Яшчэ 780 тысяч еўра выдзелена беларускім арганізацыям на рэалізацыю амаль 30 міні-праектаў. Гэта праекты па развіцці транспартнай інфраструктуры, захаванні гістарычнай спадчыны, экалагічнага кірунку, рэгіянальнага супрацоўніцтва, прадпрымальніцтва, навукі, бяспекі граніцы — усё тое, што спрыяе развіццю пагранічных тэрыторый.

За 15 гадоў фінансаванне вырасла ў пяць разоў, павялічваецца і колькасць сур'ёзных праектаў, бюджэт якіх складае да 10 мільёнаў еўра. Дзіна Ганчарова адзначыла, што цяпер рыхтуецца чарговая праграма на 2021—2027 гады, і беларусы прымуць у ёй актыўны ўдзел.

### ШАНЦ У ДАРОЖНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

Гродзенскі і Брэсцкі рэгіёны маюць выгаднае геаграфічнае становішча і шырокую сетку пагранічных пунктаў пропуску, што спрыяе наладжванню сувязяў з польскімі партнёрамі. Найбольшы рух, вядома, на аўтамагістралях. Таму папулярнымі становяцца праекты, якія дапамагаюць развіваць транспартную інфраструктуру.

Напрыклад, у Гродзенскім рэгіёне цяпер рэалізуецца адразу чатыры такія праекты. Як адзначыў **старшыня Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар ЛЯБЕЦКІ,**



Першы намеснік маршалка Падляшскага ваяводства Марэк ОЛЬБРЫШ.

усе яны датычацца паляпшэння ўчасткаў дарог, якія вядуць на Аўгустоўскі канал ці знаходзяцца паблізу.

Новы турыстычны брэнд гродзенцаў — Аўгустоўскі канал — прывабны для замежнікаў, у першую чаргу польскіх турыстаў. Спрыяе пашырэнню сувязяў і бязвізавая зона канала. Мясцовыя ўлады памежных тэрыторый выйшлі з дарожнымі праектамі і атрымалі падтрымку. Агульны бюджэт беларускага боку — амаль 4 мільёны еўра. Па ўсіх праектах атрыманы першыя траншы. Як патлумачыў Ігар Лябецкі, сродкі пайшлі на будаўніцтва дарог, набыццё новай тэхнікі, інфармацыйных знакаў.

### МЫТНЯ: ПІЛЬНА І ХУТКА

Каб зручней было наладжваць стасункі, вядзецца работа па ўдасканальванні пагранічнай прасторы. **Начальнік Гродзенскай рэгіянальнай мытні Андрэй КАВАЛЬЧУК** канстатуе: за апошнія тры гады аўтамабільны паток праз граніцу павялічыўся на трэціну. Гэта сведчыць пра ўзаемны рост абароту тавараў і колькасці турыстаў.

У найбліжэйшы час завяршаецца рэканструкцыя самага буйнога на беларуска-польскай граніцы пункта пропуску «Брузгі». Тут будзе ўдасканалена сістэма рэнтген-сканавання. Аб'ем фінансавання ў рамках праекта складзе больш за 3 мільёны еўра. Новыя падыходы дазволяць павялічыць прапускную здольнасць у два разы і дасягнуць лічбы ў 1600 транспартных сродкаў за суткі. Будзе ўзноўлены пешаходны рух, што актуальна для жыхароў пагранічча.

Разгрузіць граніцу дазваляюць лагістычныя цэнтры. Яны з'яўляюцца каля буйных пагранпераходаў. Цяпер завяршаецца будаўніцтва такога цэнтра ў пункце пропуску «Бераставіца». На сістэму дагляду ЕС выдзелена 4,5 мільёна еўра ў рамках трансгранічнага праекта. Гэта дазволіць значна павялічыць прапускную здольнасць.

Па гэтай жа лініі вядзецца мадэрнізацыя сістэмы відэаагляду. Між іншым, нядаўна атрымана дапамога ад КНР — тамографы, дэтэктары па распазнаванні выбуховых рэчываў і цікавая навінка — аўтамабіль, які ездзе без кіроўцы.

### БЯСПЕКА ПАГРАНІЧНАЙ ПРАСТОРЫ

У гэтым бачаць сваю задачу выратавальныя службы абедзвюх краін, паведаміў **намеснік начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Аляксандр ЖАМЧУЖНІКАЎ.**

Па праекце «Захаваем Белавежскую пушчу разам», які рэалізуецца сумесна з брэсцкімі і польскімі калегамі, набыты камплект тэхнікі, у тым ліку аўтамабілі павышанай праходнасці. На гэтыя мэты было атрымана 870 тысяч еўра.

Па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва адбудзецца рэканструкцыя вучэбна-трэніровачнага комплексу, набыццё інвентару для міжнародных спаборніцтваў. Дарэчы, не так даўно Гродна прымала сусветны чэмпіянат па пажарна-выратавальным спорце. На гэты праект з боку ЕС атрымана 450 тысяч еўра.

Яшчэ два праекты распачнуцца ў ліпені. Адзін з іх накіраваны на бяспеку трансгранічнай прасторы ў выпадку экалагічнай катастрофы. Бюджэт беларускага боку складае 750 тысяч еўра. Плануецца набыццё пажарнага аўтапад'ёмніка вышынёй не менш за 50 метраў.

У рамках другога праекта будзе пабудаваны аварыйна-выратавальны комплекс на тэрыторыі Аўгустоўскага канала, а таксама набыты аўтамабіль павышанай праходнасці і катар. Па словах Аляксандра Жамчужнікава, такія праекты дазваляюць палепшыць каардынацыю дзеянняў, скарыстаць новыя тэхналогіі і павысіць кваліфікацыю выратавальнікаў.

Цяпер на чарзе праект па гісторыі пажарнай службы. І гэта даволі значная справа, якая прадугледжвае рэканструкцыю пажарнай каланчы — помніка гісторыі і архітэктуры ў Гродне. На гэтыя мэты, а таксама на вучэбныя праграмы будзе выдаткаваны 1 мільён еўра. Такі ж праект будзе ажыццяўляцца і ў Беластоку.



Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ і старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— На Беларуска-польскім эканамічным форуме абмяркоўваюцца вельмі актуальныя пытанні. Гэта наша агульная гісторыя, і мы павінны зрабіць унёсак у далейшае развіццё добрасуседскіх адносін. У Гродзенскай і Брэсцкай абласцях рэалізуецца каля 50 сумесных праектаў. Лічу, што іх можа быць значна больш. Ёсць дамова з гандлёва-прамысловымі палатамі і польскай Акадэміяй навук аб правядзенні Форума ідэй, для таго каб такіх сумесных праектаў стала яшчэ больш.

**Фота БелТА.**



# Шляхам Тызенгаўза,

## У Гродне з'явіцца гарадская ратуша, ад якой

**З гэтай мэтай пачалася рэканструкцыя былой рэзідэнцыі гродзенскага старасты Антонія Тызенгаўза. Будынак быў узведзены роўна 250 гадоў таму. Пасля рэканструкцыі тут будуць прымаць замежныя дэлегацыі, прэзентаваць горад для інвестараў і бізнесменаў.**

У сярэднявеччы ў Гродне была свая ратуша, якая знаходзілася непадалёку ад каралеўскіх замкаў. Тут праходзілі пасяджэнні магістрата і органаў мясцовага самакіравання. У XVI стагоддзі, падчас ваенных дзеянняў, будынак быў спалены і разбураны, потым яго наогул разабралі. Цяпер пра ратушу нагадвае толькі гадзіннік, які цудам дайшоў да нашых часоў і ўсталяваны на Фарным касцёле. Дарэчы, ратушны гадзіннік лічыцца адным з самых старых вежавых гадзіннікаў Еўропы, яго адрамантавалі, і ён цяпер спраўна ходзіць, нават з боем.

Новая ратуша з'явіцца таксама непадалёку, у цэнтры горада, у адным са старажытных будынкаў на цяперашняй плошчы Тызенгаўза. Тут захаваліся пабудовы XVIII стагоддзя, узведзеныя падчас росквіту горада. У тыя часы горадам, па сутнасці, кіраваў староста Антоній Тызенгаўз, адзін з будынкаў стаў яго асабістай рэзідэнцыяй. Менавіта гэты двухпавярховы асабняк і прэтэндуе на новы статус.

— Гэты будынак можа выконваць функцыі ратушы, якой пакуль няма, — лічыць каардынатар праекта дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета Сяргей Каляда. — Тут можна прымаць гасцей, весці перагаворы з партнёрамі. У самім будынку мэры мала месца.

А яшчэ гэта спроба вярнуць велічны стыль каралеўскаму гораду. Некалі заканадаўцам гэтага стылю стаў сам кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, які меў у Гродне сваю рэзідэнцыю і быў прыхільнікам раскошы. Вось і новы праект накіраваны на тое, каб адлюстраваць гэту велічнасць і прыгажосць.

— Канферэнц-зала будзе падобна на сенатарскую, што ў каралеўскім палацы, — кажа Сяргей Каляда. — Кароль тут, хутчэй за ўсё, таксама быў, яны сябравалі з віцэ-адміністратарам Тызенгаўзам.

Інтэр'ер шукалі доўга. На жаль, эскізаў самога памяшкання не засталося. Таму вырашылі скарыстацца аналагамі іншых каралеўскіх залаў. Напрыклад, лесвіцу пераналі ў палацы Браніцкіх, што ў польскім Беластоку. Адтуль і свяцільні ў выглядзе павукоў. Своеасаблівыя столі дазволяць зрабіць цікавае асвятленне. Увогуле будынак будзе прыдатны як для афіцыйных сустрэч, так і для культурных падзей. Мяркуецца арганізаваць тут музычны салон з камінам, галерэю для выставак мастакоў. Дзверы будуць адчынены і для турыстаў.

— Пад будынкам захаваліся падвалы ў добрым стане, яны на дзіва сухія, са старажытнымі перакрыццямі. Тут з'явіцца кавярня на 20 месцаў з выхадам на плошчу, з пандусам і ліфтам, — падкрэсліў дэпутат. — Мяркуем назваць кавярню «Сакулка».

І гэта невыпадкова. Гродна і невялікі польскі гарадок Сакулка бліз мяжы звязаны гістарычным мінулым. У свой час гродзенскі

На хвалі

# РАМАНТЫКА З XVI СТАГОДДЗЯ

Спектакль «Чорная панна Нясвіжа» паводле п'есы Аляксея Дударава цяпер можна не толькі ўбачыць, але і пачуць — у пастаноўцы канала «Культура» Беларускага радыё. Прэм'ера яго адбудзецца ў праграме «Радыётэатр плюс» 23 чэрвеня а 19-й гадзіне — у эфіры, а таксама на сайце www.radiokultura.by.

Як сцвярджае дырэктар канала «Культура» Уладзімір Трапянок, знакамітая легенда не страчвае актуальнасці і ў наш час: «Мы вырашылі запісаць спектакль «Чорная панна Нясвіжа» для захоўвання ў радыёфондах, што зробіць яго даступным для мільённай аўдыторыі і цяпер, і ў наступныя дзесяцігоддзі. У супольнай рабоце акцёраў-купалаўцаў, каманды канала і кампазітара Віктара Капыцько атрымаўся сапраўдны гімн вялікаму каханню, якое не мае межаў».

У пастаноўцы ўдзельнічалі Валянціна Гарцуева (Барбара Радзівіл), Павел Астравух (кароль Жыгімонт), Ала Ельяшэвіч (Бона Сфорца), Ігар Дзянісаў (Радзівіл Руды), Аляксандр Паўлаў (Радзівіл Чорны) і іншыя акцёры тэатра імя Янкі Купалы, а таксама аўтар п'есы Аляксей Дудараў, які выканаў ролю вядучага.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**




## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 71

Сёлета святкуе 70-гадовы юбілей магілёўскі шахматыст і педагог Валерый Фёдаравіч Фрыгін. З 1965 года ён надрукаваў каля 100 задач і эцюдаў, атрымаў 40 адзнак у конкурсах, двойчы быў «бронзавым» прызёрам чэмпіянату БССР. Найбольшых поспехаў дасягнуў у рашэнні шахматных кампазіцый: 18-разовы чэмпіён Беларусі, другі і трэці прызёр чэмпіянатаў СССР, майстар спорту СССР. Вось адна з яго мініяцюр ***(гл. дыяграму)***.




**Белыя:** Крс3, Фа3, Лg1, Лg5, Кg3 (5).

**Чорныя:** Крh3, пс6 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Чэмпіёнамі Беларусі сярод мужчын і жанчын сталі гросмайстар Аляксей Аляксандраў і 12-гадовая дэбютантка Саша Тарасенка. Падрабязнасці — у наступным выпуску.

* * *

Завяршыліся першынствы Беларусі сярод шахматыстаў да 20 гадоў. У юнакоў асноўная барацьба разгарнулася паміж міжнароднымі майстрамі Вячаславам Зарубіцкім і Міхаілам Нікіценкам, якія фінішавалі адпаведна на першым і другім месцах (трэцяе заняў Іван Рунец). У дзяўчат упэўненую перамогу атрымала самая маладая ўдзельніца — Саша Тарасенка. Два наступныя прызавыя месцы занялі Яна Ільючык і Арына Кузіч. Вось як перамагалі чэмпіёны.

Вячаслаў Зарубіцкі — Арцём Сіняўскі. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Кc3 Сb4 4. e5 c5 5. a3 С:c3+ 6. bc Кe7 7. Фg4 Фc7 8. Ф:g7 Лg8 9. Ф:h7 cd 10. Кe2 Кbc6 11. f4 dc 12. h4 b6 13. К:c3 Кd4 14. Лh3 Сd7 15. a4 Лg6 16. h5 К:c2+ 17. Крd2 К:a1 18. hg Кb3+ 19. Крc2 Кd4 20. Крb1 0-0-0 21. Сa3 С:a4 22. Сa6+ Крd7 23. Ф:f7 Лe8 24. Крb2 b5 25. С:e7 Фc4 26. Сb4+ Крc6 27. Фb7х.

Аляксандра Шабан — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 c5 2. Кf3 Кc6 3. d3 e6 4. g3 g6 5. Сg2 Сg7 6. 0-0 Кge7 7. Лe1 d5 8. Кbd2 0-0 9. e5 Фc7 10. Фe2 g5 11. К:g5 Ф:e5 12. Ф:e5 К:e5 13. Кgf3 К5c6 14. a3 Кf5 15. c3 b5 16. Лb1 a5 17. Кf1 b4 18. Сd2 Сa6 19. g4 Кfe7 20. Лe3 d4 21. cd cd 22. Лee1 С:d3 23. Лbd1 Сc2 24. Лa1 b3 25. Сc1 Кd5 26. К1d2 Кf4 27. Сf1 Лfb8 28. К:b3 Л:b3 29. С:f4 Л:f3 30. Сg3 Лb3, 0:1.

* * *

У Оршы прайшлі першынствы Беларусі па рапідзе і бліцы да 8, 10 і 12 гадоў. Пераможцамі ў рапідзе сталі: да 8 гадоў — Мікіта Новікаў і Кіра Ізафатава, да 10 — Арцём Шыдлоўскі і Каця Зубкоўская, да 12 — Міхей Навуменка і Ксенія Норман. У бліцы: да 8 — Саша Ліхадзееў і Кіра Ізафатава, да 10 — Андрэй Руднеў і Каця Зубкоўская, да 12 — Арцём Бяляўскі і Ліза Андруховіч.

* * *

13-гадовы Дзяніс Лазавік заняў другое месца ў расійскім горадзе Кірышы на 17-м турніры «Юныя зоркі свету» (Мемарыяле Вані Сомава). Вось адна з яго перамог.

Дзмітрый Кузняцоў — Дзяніс Лазавік. 1. d4 d5 2. c4 c6 3. g3 Кf6 4. Кf3 Сf5 5. Сg2 e6 6. 0-0 Кbd7 7. Кc3 h6 8. e3 dc 9. Кe5 К:e5 10. de Ф:d1 11. Л:d1 Кd7 12. e4 Сg6 13. f4 Сc5+ 14. Крf1 Сh5 15. Лe1 0-0-0 16. h3 Сg6 17. Крe2 Крc7 18. Сe3 С:e3 19. Кр:e3 Кc5 20. Лed1 b5 21. Сf1 b4 22. Кe2 Л:d1 23. Л:d1 С:e4 24. Кd4 Сd5 25. Лc1 Кd3 26. С:d3 cd 27. Кр:d3 Крb6 28. b3 a5 29. Крe3 Лa8 30. Кc2 c5 31. Крd3 a4 32. Кe3 ab 33. К:d5+ ed 34. ab Лa3 35. Лb1 c4+ 36. Крc2 Л:b3 37. Л:b3 cb+ 38. Кр:b3 Крc5 39. f5 d4 40. g4 Крd5 41. Кр:b4 Кр:e5 42. Крb3 Крf4, 0:1.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Ф:c6! (не вядзе да мэты 1. Лc4? c5!). Першымі адказалі Уладзімір Ізотаў, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Тры нагоды ўключыць тэлевізар

## II ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ



www.minsk2019.by

Эстафета «Полымя міру» ў Мазыры.

Спадары балельшчыкі, вы дачакаліся! З 21 чэрвеня ў эфіры тэле- і радыёканалаў Белтэлерадыёкампаніі — галоўныя спартыўныя старты гэтага лета. Каналы «Беларусь 5» і «Беларусь 5. Інтэрнэт» не толькі рыхтуюць вялікую колькасць новых тэматычных праектаў, але і наогул пераходзяць на кругласутачнае вяшчанне.

«Мы плануем паказаць максімальную колькасць спаборніцтваў у эфіры чатырох каналаў: спартыўных «Беларусь 5», «Беларусь 5. Інтэрнет», а таксама «Беларусь 1» і «Беларусь 2», — адзначылі ў медыяхолдынгу. — На пляцоўках Гульняў будуць заняты амаль усе нашы супрацоўнікі, ад каментатараў і спецыяльных карэспандэнтаў да рэжысёраў, аператараў і тэхнічнага персаналу». Тэлевізійнікі абяцаюць індывідуальна падладзіцца пад кожны з відаў спорту: напрыклад, на велагонках камеры будуць усталяваныя на верталётах і байках, а падчас спаборніцтваў па веславанні на байдарках і каноэ — на катамаранах і квадракоптарах. А ўсяго за час Гульняў у эфір выйдзе каля 600 гадзін відэакантэнту!

## ГЕРОІ

На гэтым тыдні ў эфіры «Беларусь 1» пачаўся шматсерыйны цыкл «Незабыты подзвіг», прысвечаны гераізму юных беларусаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Незаслужана забытыя, пастаўленыя пад сумнеў, запісаныя ў разрад «ідэалагічных міфаў» — журналісты Агенцтва тэленавін на працягу года праводзілі ўласнае расследаванне і з дапамогай архіўных дакументаў і ўспамінаў сведкаў згадалі гераічныя ўчынкі дзяцей, якія ўступілі ў бітву з ворагам нароўні з дарослымі. Так, аўтары дакументальнага цыклу ўжо расказалі пра ўраджэнку Віцебшчыны Зіну Партнову, якая, працуючы ў сталоўцы на акупаванай тэрыторыі, атруціла больш за сто нямецкіх афіцэраў.

На чарзе — аповед пра подзвіг партызана-разведчыка Марата Казея, які ў апошнім баі падарваў сябе разам з гітлераўцамі (дарэчы, у гэтым эпізодзе сыграў галоўную ролю яго нашчадак — праўнук сястры Героя Савецкага Саюза, Арыядны Казей), і пра ўраджэнца Быхаўшчыны Марата Казлова — на пачатку вайны яму было ўсяго 11 гадоў, але хлопчык праявіў недзіцячую стойкасць у барацьбе з ворагам... Кожны расказ дапоўнены рэканструкцыяй падзей і інтэрв'ю з экспертамі, гісторыкамі, якія раскрываюць некаторыя малавядомыя факты з жыцця герояў. Новыя серыі цыклу «Незабыты подзвіг» «Беларусь 1» пакажа ўвечары па аўторках.



## КІНО ПЛЮС



Прыкмета нашых дзён — гістарычныя флэшмобы ў сацыяльных сетках: «Якімі вы былі 10 гадоў таму», «Прыгадайце свае 90-я» і г. д. Штосьці падобнае, але значна больш маштабнае, вырашылі рэалізаваць і тэлевізійнікі. З 16 чэрвеня па нядзелях на АНТ — новы праект «Камера. Матор. Краіна» пра кіно і гісторыю. Вядучая Юлія Мяньшова ў кожным выпуску будзе задаваць тэму гутаркі: браць адзін мастацкі фільм або тэлесерыял савецкага часу ці першага постсавецкага перыяду і на яго прыкладзе ўспамінаць, як жыла краіна і суайчыннікі ў год выхаду фільма на экраны.

Гасцямі студыі стануць непасрэдныя ўдзельнікі здымак — рэжысёры, акцёры, прадзюсары і іншыя людзі, якія сталі папулярнымі ў гэты час. Яны раскажуць, чым адзначыўся канкрэтны год у памяці, што адбывалася ў іхнім жыцці. І, канешне, паглядзяць найбольш уражлівыя ўрыўкі з кінастужак, на якіх вырасла цэлае пакаленне: «Піраты ХХ стагоддзя», «Каліна чырвоная», «Вялікі перапынак», «ТАСС упаўнаважаны заявіць» і многіх, многіх іншых.

**«Свежыя навіны ад «Звязды»!»**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г., запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.



Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2019 года будуць разыграны сем умывальнікаў «Акватэкс» і суперпрыз — душавая кабіна «Акварэль». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Свежыя навіны ад «Звязды»!» чытайце ў нумары 99 газеты «Звязда» ад 30.05.2019 г.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2019 да 30.09.2019.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2019 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

______ **на III квартал або II паўгоддзе 2019 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.25, 8.20** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.15, 8.10** Навіны эканомікі.
**7.20, 8.15, 18.10** «Зона Х» (16+).
**9.15 Серыял «След» (16+).**
**10.05, 18.35, 19.25 Серыял «Ад-дай маю мару» (16+).**
**12.05** ІІ Еўрапейскія гульні.
**13.00** «Дзіцячы доктар».
**13.35** «Дзень у вялікім гора-дзе».
**14.35, 15.20 Серыял «Чорная кошка» (16+).**
**16.40 Серыял «Сваты-6» (12+).**
**17.40** «БССР. Невядомая гісто-рыя». Дак. фільм (12+).
**21.00** «Панарама».
**21.55** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Цырымонія адкрыцця.
**0.40 Камедыя «Пятніца» (16+).**

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**8.55** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба з лука. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя.
**11.50, 18.45** «Тэлебарометр».
**11.55, 18.50 Серыял «Опер па выкліку» (16+).**
**13.10** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Бокс. Мужчыны. Кваліфіка-цыя. Стральба з лука. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя.
**17.50 Серыял «Жаночы док-тар-2» (16+).**
**20.40** «Хто я?» (12+)
**21.00** «Вясельны памер» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 17-ы сезон» (16+).
**0.05** «Муж напракат» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Цатні.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны куль-туры.
**8.25, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 18.00 «Зімовая вішня». Маст. фільм, заключная се-рыя (12+).**
**9.25, 15.40 «Трэцяя ракета». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.50** «Майстэрня. Гісторыя ад-нага мастака». Вера Бліннова і Любоў Кірылава.
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Яў-ген Еўсігнееў (12+).
**12.50** «Сіла веры».
**13.15, 18.55** «Ваенны ўрач. Ва-лянцін Война-Ясянецкі. Свяці-цель-хірург». Дак. фільм (12+).
**13.50, 21.45 «Апостал». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**14.45** «Артэфакты». Страдзецкі скарб [СЦ]
**15.10** «Запіскі на палях». Кан-драт Крапіва: чалавек, які смя-яўся... [СЦ].
**17.00** «Аура ў Купалаўскім». Кан-цэрт.
**19.35** «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Фё-дар Балабайка.
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35** В. Кузняцоў. «Анастасія». Балет Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

## Беларусь 5

**7.05** Гульні.by.
**7.25** Наша Алімпіяда.
**8.00** Трэніровачны дзень.
**8.35, 12.30, 17.30, 0.30** Еўра-цэнтр.
**8.50** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд.
**12.45** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба з лука. Кваліфі-кацыя. Мужчыны. Жанчыны.
**13.50** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд.
**17.45** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба з лука. Кваліфіка-цыя. Мікст. Мужчыны. Жанчыны. Бокс. Кваліфікацыя. Мужчыны.
**20.50** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Прэв'ю на арэне.
**21.50** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Урачыстая цырымонія ад-крыцця.
**0.45** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Вынікі дня.
**1.15** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба з лука. Квалі-фікацыя. Мужчыны. Жанчыны. Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жан-чыны. Папярэдні раўнд.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субціт-рамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.50** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Аўташкола» (12+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Умовы кантрак-ту» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.35** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.40** «Эксклюзіў» (16+).
**18.20** «Вакол смеху» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзён-нік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Тры акорды» (16+).
**23.10** «Што? Дзе? Калі?» у Бе-ларусі». Летняя серыя гульняў (16+).

## СТБ

**5.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+)
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзі-ны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.50** «Раніца. Студыя доб-рага настрою» (6+).
**7.40, 13.50, 16.50** «Экстранны выклік».
**9.15** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**9.35, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Паляванне на Берыю». Серыял (12+).**
**14.00** «Неверагодна цікавыя гіс-торыі» (16+).
**15.00, 17.00 «У чэрвені 41-га». Серыял (12+).**
**20.00** «Сталічныя падрабяз-насці».
**20.25, 22.55** «СТБ-спорт».
**21.15, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**0.35 «Метад». Серыял (18+).**

## МІР

**6.00, 3.15 Серыял «1942» (12+).**
**9.25** Дак. фільм «Вайна на рэй-ках» (16+).
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**10.20, 13.15 Серыял «Бліндаж». 1—3-я серыі (12+).**
**15.15, 16.15, 19.20 Серыял «1943» (16+).**
**23.55 Маст. фільм «А золкі тут ціхія» (12+).**
**3.15 Серыял «1942» (12+).**
**5.40** М/ф (0+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.25 Серыял «Дзяржаў-ная граніца» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10** Маст. фільм «Сіла абставінаў» (12+).
**0.00** «Хто супраць?» Ток-шоу.

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**6.30** «Гісторыі рамонту» (0+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Мухтар. Но-вы след» (16+).**
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.45, 10.20 Серыял «Пчаляр» (16+).**
**9.40, 22.55** «НЗ.by».
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25 Серыял «Марскія д'ябль» (16+).**
**16.30** «Агляд. Надзвычайнае зда-рэнне».
**17.05** «ДНК» (16+).
**18.05, 19.50 Серыял «Люты-2» (16+).**
**19.35** «Сёння. Галоўнае».
**23.30** «Остарбайтары». Дак. фільм (12+).

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.05, 21.05, 1.30** «Надвор'е + Эрана».
**7.05, 16.05** М/с «Прынцэса Алена».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Баявік «Шаравая маланка» (12+).**
**9.40, 19.10 Серыял «Часова не-даступны».**
**10.30** Дак. серыял «Каманда 95-га квартала».
**11.20** М/ф.
**11.35, 20.00 Серыял «Трэцяе вока».**
**12.20** Баявік «Пантэра» (16+).
**14.30 Серыял «Застацца ў жы-вых».**
**16.30** «Сіньцзян».
**17.00** Дак. фільм «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе».
**17.30 Камедыя «Ноч у музеі».**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10** «Вячэрні квартал-95».
**22.40 «Героі коміксаў на экра-не». Маст. фільм «Сапраўдны герой» (12+).**
**0.40 Серыял «Карнік» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** «Ералаш» (6+).
**8.40** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.05** М/ф «Машкіны стра-шылкі» (0+).
**9.35, 0.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**11.00, 4.20** «Супермамач-ка» (16+).
**13.10, 1.00** Серыял «Ва-роніны» (12+).
**14.45** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.30** Баявік «Цэнтуры-ён» (16+).
**17.30** Серыял «Шчаслі-выя разам» (16+).
**19.00, 3.30** Серыял «Ан-жаліка» (16+).
**20.00** Серыял «Кухня-6» (16+).
**21.00** Серыял «Атэль «Эле-он» (16+).
**22.00** Баявік «Даспехі бо-га» (12+).
**2.15** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Наві-ны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква акадэмічная.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** Легенды кіно. Саве-лій Крамараў.
**8.05** Замежная справа. «Вялікі пасол».
**8.50, 21.45** «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм [СЦ] (0+).
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** «Кінограф. Шчіріц і іншыя». 1993 г.
**12.05** «Уладары кольца. Гісторыя стварэння сінхра-фазатрона». Дак. фільм.
**12.30** «Штучны адбор».
**13.15** «Віктар Захарчан-ка. Партрэт на фоне хо-ру». Дак. фільм.
**14.10, 20.05** «Ключ да раз-гадкі старажытных скар-баў». Дак. серыял [СЦ].
**15.10** «Біблейскі сюжэт».
**15.40** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.25** Гісторыя мастацт-ва. Аляксей Растаргуеў. «4 элементы Джузэпэ Ар-чымбольда».
**17.20** 95 гадоў з дня на-раджэння Васіля Быкава. «Астравы» [СЦ].
**18.05, 1.30** Сімфанічныя аркестры Еўропы.
**18.45** «Адзінка захоўван-ня». Аляксандр Даўжэнка і Юлія Солнцава [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.50** «Добрай ночы, ма-лыя!»
**21.05** Вялікія рэкі Расіі. «Об».
**22.50** «Памяць». Дак. се-рыял [СЦ].
**23.40** Дзённік XVI Між-народнага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
**23.55** «Кінескоп». XXX Адкрыты расійскі кіна-фестываль «Кінатаўр».
**2.10** «Утаймаванне каня. Пётр Клот». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Віктар Цой». 2005 год (18+).
**6.50, 9.45, 11.00, 15.45, 17.00, 20.35, 21.45, 23.00, 3.45** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Тэлеспектакль «Ноч памылак». 1984 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляк-сандрам Паліткоўскім: «Як мы паступалі ў інсты-тут». 2007 год (16+).
**12.50** Фільм-спектакль «Не заплачу!» 1983 год (16+).
**14.15** Канцэрт Sixties Rock. 2004 год (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2007 год (12+).
**18.55** Маст. фільм «Эзоп» (12+).
**1.00** «Гэты фантастычны свет». «З робатамі не жар-туюць». 1987 год (12+).
**2.25** Фільм-канцэрт «Мініа-цюры». 1975 год (12+).
**4.00** Фільм-спектакль «Белы снег. Гора не маё». 1986 год (16+).
**5.25** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год (16+).

## EuroSport 1

**0.35, 4.00, 8.00, 13.00, 17.45** Настольны тэніс. Сусветны тур.
**1.30, 3.30, 9.30, 21.00** Аў-тагонкі. Формула Е.
**2.00, 15.30** Алімпійскія гуль-ні. «Жывыя легенды».
**2.30, 6.00, 10.00, 14.30** Ве-ласпорт. «Крытэрыум Да-фінэ».
**0.05, 11.00, 18.50, 23.30** Фехтаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**7.00, 12.00** Аўтагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана».
**9.00, 14.00, 18.45** Watts.
**15.30, 22.00** Веласпорт. «Тур Славеніі».

## Кінакамедыя

**0.40** Авечка Долі была злая і рана памерла (6+).
**2.55** Адпеты мача (16+).
**4.35** Любоўны менедж-мент (16+).
**6.20** Супер Брыс (12+).
**8.05** 100 мільёнаў еўра (16+).
**9.55** Хочаш ці не? (16+)
**11.40** Аперацыя «Тушон-ка» (16+).
**13.40** Вулкан запалу (12+).
**15.25** Вазьмі мяне штур-мам (16+).
**17.25** Ягуар (16+).
**19.30** Чаго хочуць жанчы-ны? (16+).
**21.55** Белае віно з Бабу-дою (16+)
**23.50** Таксі-5 (18+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная ка-лекцыя Беларусьфільма (12+).
**6.40** М/ф (6+).
**7.40** «Школа доктара Ка-мароўскага» (6+).
**8.20** «Доктар I...» (16+)
**8.50** «Парфумерка-2». Серыял (12+).
**10.30, 3.45** «Судовыя страс-ці». Дак. серыял (16+).
**12.10, 17.55** «Варажбіт-ка» (12+).
**13.45, 16.50, 5.15** «Міс-тычныя гісторыі» (12+).
**14.50, 4.35** «Суд ідзе» (16+).
**15.55** «Натуральны ад-бор» (12+).
**19.10, 2.15** «Парфумер-ка-3». Серыял (12+).
**21.00** «Менталіст». Серы-ял (16+).
**22.50** «Лінія абароны» (16+).
**23.25** «Звышнатураль-нае». Серыял (16+).
**0.10** «Нябачны бок». Дра-ма (16+).

## ТБ1000

**6.10, 18.25** Дзеці шпіё-наў-3: гульня скончана (6+).
**8.15** Стой! Або мая мама будзе страляць (16+).
**10.15** Дарыян Грэй (16+).
**12.25** Жонка падарожніка ў часе (16+).



**14.35** Голая праўда (16+).
**16.30** Дзявяткі (16+).
**20.10** Дзевяць ярдаў (16+).
**22.15** Спадарыня Бавары (16+).
**0.30** Бойфрэнд з будучы-ні (16+).
**2.50** Двайнік (18+).
**4.20** Пакой страху (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Паляўнічы-2. Мыці-шчанскі маньяк (16+).
**8.30** Тры волаты і прынцэ-са Егіпта (6+).
**10.00** Франц + Паліна (16+).
**12.25, 4.25** Сакрэт непры-ступнай прыгажуні (16+).
**14.15** ЖАРА (16+).
**16.15** Цёмны свет (16+).
**18.20** Гетэры маёра Сака-лова (16+).
**20.20** Напарнік (12+).
**22.10** Час першых (6+).
**0.55** Зацьменне (12+).
**2.30** Населены востраў: схватка (12+).

## National Geographic

**6.00, 5.35** Навуковыя не-дарэчнасці (16+).
**6.25, 14.20** Сапраўдны ге-ній (16+).
**7.15, 13.35** Інстынкт вы-жывання (16+).
**8.05, 18.15, 22.05, 1.00, 4.05** Дзікі тунец (16+).
**9.40, 18.15, 1.05, 4.10** Су-перкар са сметніка (16+).
**10.25** Рабі стаўкі і ўзры-вай (16+).
**11.15, 16.40, 21.20, 3.15** Машыны (16+).
**12.50** Скарбы Тутанхамо-на (16+).
**15.05, 19.45, 22.45, 4.50** Як гэта звязана (16+).
**15.55, 20.30, 2.30** Рассле-даванне авіякатастроф (16+).
**19.45** Год у адкрытым кос-масе (16+).
**22.50** Уздоўж па каньёне (16+).
**0.15** Ліхтугі за мяжой (16+).
**1.45** Служба бяспекі аэра-порта (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 18.30, 1.50** Залатая ліхаманка (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махіна-тары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на рэліквіі (12+).
**13.00** Паляўнічыя на ста-рызну (12+).
**14.50, 0.00** НАСА: невы-тлумачальныя матэрыялы (12+).
**19.25** Чыгунка Аўстраліі (16+).
**20.20, 5.30** Паляўнічыя на складах (16+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (12+).
**2.45** Браты Дызель (12+).
**3.40** Умельцы супраць апакаліпсіса (12+).
**7.10** Мегаперавозкі (12+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.25 Серыял «След» (16+).**
**10.05, 18.35, 19.20 Серыял «Ад-дай маю мару» (16+).**
**12.05** II Еўрапейскія гульні.
**13.00** «Дзіцячы доктар».
**13.35** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.35, 15.15 Серыял «Чорная кошка» (16+).**
**16.50** «Беларуская часінка».
**17.45** «БССР. Невядомая гісторыя». Дак. фільм (12+).
**21.00** «Панарама».
**22.05** «Гульні.by».
**23.55** «Сфера інтарэсаў».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.00** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.00 Серыял «Слепая» (16+).**
**10.05, 22.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.05 Серыял «Опер па выкліку» (16+).**
**13.00, 23.00 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).**
**14.00** «Да пабачэння» (16+).
**14.50** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца да дапамогу» (0+).
**15.40** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**15.45, 23.55** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
**17.30** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**20.55** «Трэці лішні» (16+) [СЦ].
**22.00** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Трыбух.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 18.00 «Зімовая вішня». Маст. фільм (12+).**
**9.25, 15.40 «Воўчая зграя». Драма (12+) [СЦ].**
**10.50** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Уладзімір Новак.
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Юрый Візбар (12+).
**12.50** «Валерый Раеўскі. P.S.» Дак. фільм.
**13.15, 18.55** «Ваенны ўрач. Мікалай Бурдэнка. Вайна даўжынёй у жыццё». Дак. фільм (12+).
**13.50, 21.45 «Апостал». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**14.45** «Артэфакты». Старажытны грэбень з літарамі [СЦ].
**15.10** «Запіскі на палях»: Максім Гарэцкі: рукапісы не гараць [СЦ].
**17.10** Госці «Славянскага базару».
**19.35** «Камертон». Паэт Іван Юркін.
**20.00, 23.05** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Іспанія — Бельгія.
**8.50** Слэм-данк.
**9.20** Козел пра футбол.
**9.40** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Італія — Польшча.
**11.35** Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Шатландыя — Аргенціна.
**13.30** Тэніс. WTA. Бірмінгем. (У перапынку — «Спорт-цэнтр».)
**18.30** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Астрава.
**21.05** «Спорт-цэнтр».
**21.15** Трэніровачны дзень.
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Германія — Сербія. (У перапынку — «Спорт-цэнтр».)
**23.50** Гульні.by.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.50** «Жыць здорава!» (16+).
**11.10 Серыял «Аўташкола» (12+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Умовы кантракту» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Анёл-захавальнік» (16+).**
**23.10 Серыял «Горад» (16+).**

## СТБ

**5.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+)
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.10** «Анфас».
**9.30, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Паляванне на Берыю». Серыял (12+).**
**12.40, 21.15, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.45, 0.25** «Як устроены свет» (16+).
**15.35, 16.50 «Правакатар». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».

## МІР

**6.00, 14.50, 4.50 Серыял «1942» (12+).**
**9.25** Дак. фільм «Выратаваць Маскву» (16+).
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 13.15 Серыял «Матч» (16+).**
**15.50, 16.15, 19.20, 0.20 Серыял «1943» (12+).**
**0.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**0.50 Серыял «Перакладчык». 1—4 серыі (12+).**
**4.25** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.45** «Дзённік II Еўрапейскіх гульняў».
**11.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**12.00** Прамая лінія з Уладзімірам Пуціным.
**15.00, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.10** «Па сакрэце ўсяму свету».
**15.35** «У госці да Бога не бывае спазненняў». Дак. фільм (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.50** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.00 Серыял «Ведзьма» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**6.30** «Гісторыі рамонту» (0+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.45, 10.20 Серыял «Пчаляр» (16+).**
**9.40, 22.45** «НЗ.by».
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**12.55 Маст. фільм «Можна, я буду зваць цябе мамай?» (12+)**
**14.35 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**17.05** «ДНК» (16+).
**18.05, 19.50 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**19.35** «Сёння. Галоўнае».
**20.50 Серыял «Люты» (16+).**
**23.10 Серыял «Сёмін. Адплата» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.05, 21.00, 23.50** «Надвор'е + Эрана».
**7.05, 16.05** М/с «Прынцэса Алена».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Камедыя «Ноч у музеі».**
**9.15, 19.10 Серыял «Часова недаступны».**
**10.10** Дак. серыял «Каманда 95-га квартала».
**11.00 Дэтэктыў «Тайна ў яго вачах» (18+).**
**13.45, 20.05 Серыял «Трэцяе вока».**
**14.30 Серыял «Застацца ў жывых».**
**16.25 Драма «Крывавы алмаз» (16+).**
**18.50** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Дэтэктыў «Скурчаны дамок».**
**23.00 Серыял «Карнік».**



## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** «Ералаш» (6+).
**8.40** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.05** М/ф «Машкіны страшылкі» (0+).
**9.35, 0.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.40, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.05, 5.10** «Супермамачка» (16+).
**13.10, 1.10** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.45, 3.40** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.30** Баявік «Даспехі бога» (12+).
**19.00, 4.20** Серыял «Анжаліка» (16+).
**20.00** Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
**22.00** Баявік «Даспехі бога-2: аперацыя «Кондар» (12+).
**2.25** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).



## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква кампазітарская.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Легенды сусветнага кіно». Мэрылін Манро.
**8.05** Замежная справа. «Гаспадыня Еўропы».
**8.50, 21.45** «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм [СЦ] (0+).
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** «Генадзь Гладкоў». Фільм-канцэрт. 1988 г.
**12.15** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**12.30** «Штучны адбор».
**13.15** «Генерал Рошчын, муж Маргарыты». Дак. фільм.
**14.10, 20.05** «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял [СЦ].
**15.10** Пернікавы домік. «Сахалар — нашчадкі кавалёў» [СЦ].
**15.40** «2 Вернік 2».
**16.35** «Чаму сабакі не ходзяць у музей? або Пазітыўны погляд на сучаснае мастацтва». Дак. фільм.
**17.20** «Астравы». Юрый Нікулін [СЦ].
**18.05, 1.35** Сімфанічныя аркестры Еўропы.
**18.45** «Адзінка захоўвання». Элем Клімаў і Ларыса Шапіцька [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.50** «Добрай ночы, малыя!»
**21.05** Вялікія рэкі Расіі. «Кубань».
**22.50** «Памяць». Дак. серыял [СЦ].
**23.40** Дзённік XVI Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
**23.55** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**2.30** «Уладары кольца. Гісторыя стварэння сінхрафазатрона». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Як мы паступалі ў інстытут». 2007 год (16+).
**6.50** Фільм-спектакль «Не заплачу!» 1983 год (16+).
**8.15** Канцэрт «Sixties Rock». 2004 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**6.50, 9.45, 11.00, 14.35, 15.45, 17.00, 20.25, 21.45, 23.00, 0.50, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**12.55** Маст. фільм «Эзоп» (12+).
**18.00** Фільм-спектакль «Далей — цішыня» тэатра імя Массавета. 1978 год (12+).
**0.00** «СеваАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Віктар Цой». 2005 год (18+).
**1.00** Тэлеспектакль «Ноч памылак». 1984 год (16+).

## EuroSport 1

**0.45, 4.00, 7.00, 9.35, 13.30, 17.30, 23.00** Веласпорт. «Тур Славеніі».
**1.30** Настольны тэніс. Сусветны тур.
**2.30, 6.30, 9.00, 13.00, 18.20, 21.10** Аўтагонкі. Формула Е.
**3.00, 5.00, 11.00** Аўтагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана».
**6.00, 10.30** Watts.
**8.00, 12.00, 18.50** Фехтаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**16.00, 21.35** Веласпорт. «Рут д'Аксітанія».

## Кінакамедыя

**1.30** Даю год (16+).
**3.10** Спытайце Сіндзі (16+).
**4.50** Дзень выбараў па-французску (16+).



**6.25** Авечка Долі была злая і рана памерла (6+).
**8.45** Горка ў Мексіцы (16+).
**10.25** Горка (16+).
**12.25** Горка!-2 (16+).
**14.20** Маска Зора (12+).
**17.00** Легенда Зора (6+).



**19.30** Робін Гуд (16+).
**22.00** Дзень сурка (12+).
**23.55** Красуні (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.20** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+).
**8.20, 19.05, 3.00** «Парфумерка-3». Серыял (12+).
**10.00, 23.45** «Улегцы» (12+).
**10.30, 5.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10, 17.50** «Варажбітка» (12+).
**13.45, 16.45** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.50** «Суд ідзе» (16+).
**15.55** «Натуральны адбор» (12+).
**21.00** «Менталіст». Серыял (16+).
**22.55** «Знак якасці» (16+).
**0.15** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**1.00** «Праметэй». Фантастыка (16+).



**4.35** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.50** Кейт і Леа (12+).
**8.30** Спадарыня Бавары (16+).
**11.05** Бойфрэнд з будучыні (16+).
**13.30** Дзевяць ярдаў (16+).



**15.40** Пакой страху (16+).
**20.10** Птушачка на провадзе (16+).
**22.25** Мільён для чайнікаў (16+).
**0.25** Сафі і ўзыходзячае сонца (18+).
**2.25** Мабільнік (18+).
**4.15** Законы прыцягнення (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Час першых (6+).
**9.05** Напарнік (12+).
**10.55** Зацьменне (12+).
**12.30, 4.30** Тэрмін даўнасці. 1—2 серыі (16+).
**14.20** Сволачы (16+).
**16.20** Нявеста любой цаной (16+).
**18.20** Гетэры маёра Сакалова (16+).
**20.20** Пацыенты (16+).
**22.10** Каралёў (12+).
**0.30** Выпускны (18+).
**2.35** Паляўнічы-1. Чалавек з мінулага (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25, 14.20** Сапраўдны геній (16+).
**7.15, 13.35** Інстынкт выжывання (16+).
**8.05** Дзікі тунец (16+).
**10.20** Рабі стаўкі і ўзрывай (16+).
**11.10, 16.40, 21.10, 3.30** Машыны (16+).
**12.45** Чорныя фараоны (16+).
**15.00, 19.45, 5.15** Як гэта звязана (16+).
**15.50, 20.30, 2.45** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**18.10, 22.00, 1.05, 4.20** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**19.50** Уздоўж па каньёне (16+).
**22.50, 0.20** Ліхтугі за мяжой (16+).
**23.35** Дзіўная Другая сусветная (16+).
**2.00** Гарачыя межы (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 18.30, 1.50** Залатая ліхаманка (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на рэліквіі (12+).
**13.00** Разбуральнікі легенд (16+).
**19.25** Чыгунка Аўстраліі (12+).
**20.20, 5.30** Бітвы за кантэйнеры (16+).
**0.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (12+).
**2.45** Браты Дызель (12+).
**3.40** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
**7.10** Мегаперавозкі (12+).

# ЧЭСЛАЎ НЕМЕН. ВЯРТАННЕ Ў БРОНЗЕ

## Адкрыццё мемарыяльнай дошкі з выявай знакамітага музыканта адбылося ў Гродне з удзелам прадстаўнікоў улад Беларусі і Польшчы, а таксама ўдавы музыканта

**На ўрачыстасці прысутнічаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч, маршал Сената Польшчы Станіслаў Карчэўскі, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Беларусі Артур Міхальскі. І гэта невыпадкова, бо музыкант і спявак Чэслаў Немен належыць абедзвюм краінам. У Беларусі ён нарадзіўся і правёў юнацкія гады, а ў Польшчы заявіў пра сябе як таленавіты творца, вядомы ва ўсім свеце. Сёлета яму споўнілася б 80 гадоў.**



Мемарыяльную дошку ўсталявалі на будынку былога музычна-педагагічнага вучылішча Гродна, дзе цяпер знаходзіцца гуманітарны каледж. Тут у сярэдзіне 50-х гадоў вучыўся будучы рок-музыкант, які стварыў свой асобны стыль і быў вельмі папулярны ў 60—70-я гады. Самы вядомы яго твор — «Дзіўны гэты свет». А песню «Ці яшчэ памятаеш мяне?» узяла ў свой рэпертуар зорка кіно і спявачка Марлен Дзітрых.

Многія гродзенцы, якія прыйшлі на ўрачыстае адкрыццё, захапляліся творчасцю свайго земляка. Барбара — адна з тых, хто пабываў на яго канцэрце ў 1976 годзе. Гэта быў знакаміты тур па Савецкім Саюзе, у рамках якога Немен выступіў у Гродне і Мінску. Жанчына ўспамінае, што спявак выйшаў на сцэну са сваім інструментам, які гучаў як цэлы аркестр.

— Я чула, што ён сам змайстраваў яго, — згадвае Барбара. — у той час Чэслаў быў ужо вядомы музыкант. Ён спяваў дзесьці гадзіну, і ўваход быў вольны. Лічу, што Немена нельга паўтарыць, ён унікальны.

На гэтым канцэрце пабываў і вядомы гродзенскі краязнаўца, уладальнік музея гарадскога побыту Януш Паруліс. Яго маленькая дачка паднесла тады музыканту кветкі. Але самая нечаканая падзея адбылася пасля канцэрта. Позна вечарам, расказвае Паруліс, да яго нехта пастукаў у акно. Адкрыў — а там стаіць Чэслаў. Аказваецца, ён прывёз сваім сябрам па вучылішчы электрагітару — вельмі вялікі дэфіцыт у той час. Але сяброў не застаў і пайшоў да суседняга дома. Такім чынам, малады тады Януш дапамог Немену знайсці сваіх калег-музыкантаў, якія гралі непадалёку, у парку.

— Я не ведаў тады, што буду мець свой музей, а то, можа, і сам купіў бы ў яго тую гітару, — кажа Паруліс. — Гэта быў наш кумір, ён тут вучыўся, і мы ведалі пра яго. У мяне ёсць яго пласцінкі, запісы...

Сам аўтар бронзавага партрэта, вядомы гродзенскі скульптар Уладзімір Панцялееў, таксама з ліку фанатаў. Пры рабоце над вобразам карыстаўся фотаздымкамі, якія дала жонка музыканта. Шмат часу занялі ўзгадненні — было прапанавана 10 эскізаў. Але самым складаным стаў вызначаны тэрмін — ён быў надзвычай кароткі. Трэба бало працаваць і дзень і ноч, кажа аўтар. Узніклі праблемы з матэрыялам, доўга шукалі італьянскі граніт і знайшлі на адным з прадпрыемстваў у Гродзенскім раёне.

Дарэчы, удава спевака Малгажата Немен-Выджыцка высока ацаніла гэту работу. Яна прыехала на адкрыццё мемарыяльнай дошкі з Варшавы. Сама Малгажата таксама творчая асоба — у 70—80-я гады яна была вядомай мадэллю, а яшчэ яна мастачка і актрыса.

Падчас урачыстасці мне давялося пагутарыць з гэтай ветлівай жанчынай. Яна прызналася, што вельмі рада пабываць тут, у Гродне, дзе ўшаноўваюць памяць яе мужа. Дарэчы, яна і сама шэсць гадоў таму рабіла тут фотавыстаўку «Чэслаў Немен у аб'ектыве сваёй жонкі», а дачка Наталля выступіла ў драмтэатры з песнямі свайго бацькі.

У Польшчы, паведаміла Малгажата, Немен і цяпер вельмі папулярны. Нават школы названы яго імем. Яна расказала, як была ўзрушана, калі дзеці прысягалі на сцягах з яго выявай. Многія выконваюць песні спевака ў новых версіях.

На дзіва, у Польшчы няма музея Чэслава Немена. Малгажата лабіруе гэтую ідэю, робіць захады ў розныя інстанцыі, у тым ліку міністэрства культуры.

— Гэта справа не аднаго дня, — кажа жанчына. — Але я аптымістка і веру, што такі музей будзе. Можа, прысвечаны не толькі аднаму Чэславу, але і іншым музыкантам той эпохі, яго паплечнікам, якіх ужо няма сярод нас.



Пакуль у Польшчы толькі падступаюцца да стварэння музея, у Беларусі ён ужо ёсць. Магчыма — адзіны ў свеце. І знаходзіцца ён на радзіме спевака, у вёсцы Старыя Васілішкі Шчучынскага раёна, у тым самым доме, дзе музыкант нарадзіўся і пражыў 19 гадоў, пакуль сям'я Выджыцкіх не пераехала ў Польшчу. Дом тады прадалі, а пазней у ім размясцілі склад і краму. І толькі ў 2010 годзе адкрылі тут музей.

Трэба сказаць, што паломніцтва на радзіму спевака пачалося пасля яго смерці ў 2004 годзе. Усіх цікавіла: адкуль родам такі феномен? Уладзімір Сінюта працаваў тады старшынёй сельскага савета.

— Мне было няёмка, што сядзіба ў занядпадзе, плот паваліўся, на даху дзірка, падворак зарос бур'янам, — расказвае Уладзімір Уладзіміравіч. — Я нешта рабіў, каб змяніць гэты выгляд, а пасля выхаду на пенсію мяне запрасілі працаваць у музеі.

На радзіму Немена едуць турысты з Беларусі, Польшчы, Расіі і наогул з усяго свету. Напрыклад, летась тут пабывала каля сямі тысяч чалавек. Мясцовыя жыхары, а іх каля трох дзясяткаў, як могуць добраўпарадкоўваюць свае сядзібы, менш робіцца пустых дамоў. За два гады восем такіх дамоў набылі гаспадароў.

У планах — і аднаўленне дома-музея Чэслава Немена. Сёлета мяркуюць змяніць дах, зняць шыфер і пакласці драўляную гонту, як гэта было пры Выджыцкіх. Дарэчы, дому больш за сто гадоў, яго будаваў дзед Чэслава ў 1918 годзе. Цяпер тут ёсць пакой, які дае ўяўленне пра эпоху 50-х гадоў, а другая палова — непасрэдна музей творчасці музыканта.

Праўда, Малгажата, якая таксама пабывала ў музеі, звярнула ўвагу на тое, што некаторыя пласцінкі — піратскія. Маўляў, Чэслаў заўсёды дбаў пра аўтарскія правы. Калі на канцэрце яго прасілі пакінуць аўтограф на такой пласцінцы, ён адмаўляў.

Што датычыцца новых альбомаў, то такое выданне рыхтуецца сумесна з польскім радыё, паведаміла Малгажата Немен. Але яна пакуль не афішуе новы праект. Адзначыла толькі, што вядуцца перагаворы, удакладняюцца ўмовы, каб атрымаць такі прадукт, які будзе актуальны і які будуць слухаць. Дарэчы, пры жыцці спевака выйшаў 21 альбом.

І хоць Чэслаў Немен большую частку жыцця пражыў у Польшчы, яго вельмі цягнула на малую радзіму. Аднойчы ён на пару гадзін завітаў сюды на таксі аж з Масквы, дзе быў на гастролях. Яго сувязь з гэтымі мясцінамі адлюстроўвае і псеўданім — Немен — ад назвы ракі Нёман, якая працякала недалёка ад дома Выджыцкіх. Цяпер на сядзібе стаіць скульптура спевака, а каля яе расце квітнеючы куст з мядовым водарам. Букет кветак з яго дырэктар музея ўручыў жонцы спевака як прывітанне ад яго малой радзімы.

**Фота БелТА.**

ПРАЕКТЫ

# або Рэнесанс каралеўскага горада

## пачнецца міжнародны турыстычны маршрут

староста Антоній Тызенгаўз пабудаваў дзве рэзідэнцыі — адну ў Гродне, другую ў Сакулцы. Зараз абодва будынкі пустуюць.

Двухпавярховы асабняк у Гродне будаваўся па праекце італьянскага архітэктара Джузэпэ Сакі. У розныя часы тут знаходзіліся падатковыя ведамствы, паштовая кантора, з 1921 года — цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі. Цяпер вядзецца работа, каб зрабіць у былой сядзібе віцэ-адміністратара ў Гродне гарадскую ратушу. А ў Сакулцы будзе адкрыты інфармацыйны цэнтр. Больш за тое, абодва гістарычныя будынкі звяжа турыстычны маршрут, які так і называецца «Шляхам Тызенгаўза».

— Гэта будзе новы веласіпедны маршрут працягласцю 60 кіламетраў, з якіх палова — па беларускай частцы. Сумесны праект «Шляхам Тызенгаўза» дазволіць даведацца пра гістарычную і культурную спадчыну на памежжы, — падкрэсліў Сяргей Каляда.

Сумесны праект будзе рэалізаваны ў рамках трансгранічнай праграмы «Польша — Беларусь — Украіна». Беларускаму боку выдаткаваны 1,1 мільёна еўра, 10 % фінансуе Гродзенскі гарвыканкам. Першы транш у памеры 35 % ад агульнай сумы ўжо атрыманы, і вось-вось пачнуцца работы па рэканструкцыі будынка. Паралельна будзе весціся пракладка веладарожак. Частка маршрута пройдзе ад польскай мяжы ўздоўж возера Юбілейнае, тут плануецца арганізаваць месцы адпачынку. Адсюль маршрут пойдзе па вуліцах горада. Гэтая дарожка стане часткай вялікага веламаршрута праз гранічны пункт пропуску «Брузгі», а той будзе звязаны праз маршрут «Аўгуст Вела» з міжнародным Green Velo.



Праект плануецца рэалізаваць за два гады. Архітэктурная экспертыза будынка пройдзена. Каля яго з'явіцца інфакіёск для турыстаў, а таксама іншыя дапаможнікі для вандроўкі па маршруце. На месцы былога флігеля, які часткова быў знішчаны ў сярэдзіне 80-х гадоў, будзе ўсталявана лаўка з дзвюма скульптурамі, якія «прыселі адпачыць». Як яны будуць выглядаць, пакуль невядома. Для рэалізацыі будзе абраны найлепшы эскіз па выніках конкурсу. Умова адна — гэта павінна быць эпоха Тызенгаўза і караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

### НАША ДАВЕДКА

Антоній Тызенгаўз — вядомы рэфарматар і фінансіст Вялікага Княства Літоўскага, які нарадзіўся ў 1733 годзе ў Навагрудскім ваяводстве. Тое, што Гродна стала буйным гандлёвым і прамысловым цэнтрам Еўропы, — заслуга менавіта Тызенгаўза. Ён заснаваў тут 15 мануфактур, пабудаваў жылы і адміністрацыйны комплекс Гарадніца — сённяшні гістарычны цэнтр, — заснаваў першую ў Беларусі медыцынскую акадэмію. Тут быў закладзены батанічны сад — адзін з найбуйнейшых у Еўропе, адкрытыя першыя ў горадзе тэатр і тыпаграфія.

**Матэрыялы падрыхтавала Маргарыта Ушкевіч.**

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# НЕРУХОМАСЦЬ ПАВІННА «РУХАЦЦА»

**Чарговы выязны прэзідыум Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў адбыўся ў Глыбоцкім раёне таму, што тут вельмі добрыя паказчыкі выкарыстання нерухомасці. Гэтая тэма была ў цэнтры ўвагі народных выбраннікаў. Мясцовыя дэпутаты паказалі калегам будынкі, якія цяпер выкарыстоўваюцца ў якасці вытворчых і гандлёвых плошчаў, пазнаёмілі з іх гаспадарамі — дзелавымі людзьмі, якія рэалізавалі інвестыцыйныя праекты.**

**Старшыня аблсавета Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** канстатаваў, што глыбоцкі вопыт неабходна пераймаць. Тут выкарыстоўваецца прыкладна 93 % нерухомасці, няма праблем з паступленнем у бюджэт грошай за арэнду.

А сакрэт поспеху просты: на ўсіх узроўнях мясцовай улады трэба, як у Глыбоцкім раёне, падыходзіць да ўцягвання ў эканамічны абарот дзяржаўнай маёмасці не фармальна. Калі дэпутацкі корпус актыўна працуе з інвестарамі, ён можа многае.

Спікер «абласнога парламента» папрасіў, дарэчы, больш актыўна расказваць пра магчымасці выкарыстання нерухомасці. Канешне, параўнаўча вопытныя прадпрымальнікі ў курсе. А іх землякі, якія падумваюць заняцца сваёй справай? Наўрад ці. Наогул дэпутаты могуць больш актыўна рэкламаваць бізнес-магчымасці выкарыстання аб'ектаў нерухомасці, упэўнены старшыня аблсавета.

Па сутнасці, калі нерухомасць пачынаюць выкарыстоўваць, паралельна вырашаецца некалькі задач. Зразумела, уласнік будзе займацца і добраўпарадкаваннем навакольнай тэрыторыі. Ствараюцца працоўныя месцы, адпаведна вырашаецца праблема занятасці. Нярэдка арганізуецца экспарт прадукцыі, у бюджэт пералічваюцца падаткі...

Галаўны боль мясцовай улады: нерухомасці шмат, а тых, хто хоча яе купіць, мала. Напрыклад, на прэзідыуме было агучана, што за пяць месяцаў бягучага года у вобласці ўцягнулі ў абарот толькі 50 аб'ектаў, або 10 % ад запланаванага. Знеслі або дэмантавалі 13 будынкаў і збудаванняў, а плануецца на працягу года 201. Ці паспеюць разбурыць астатняе? Адказ напрошваецца адмоўны.

Нягледзячы на даручэнне кіраўніцтва аблвыканкама па прадстаўленні ў абласны тэрытарыяльны фонд дзяржаўнай маёмасці да 1 красавіка дакументаў для правядзення аўкцыёнаў, на сённяшні дзень не прынятыя рашэнні больш чым па 40 аб'ектах з 323 запланаваных. Гэты факт, як канстатаваў **кіраўнік фонду Віктар ЗАЙЦАЎ**, — вынік нізкай выканальніцкай дысцыпліны асобных спецыялістаў на месцах, таксама ён сведчыць пра нездавальняючае вядзенне бухгалтарскага ўліку, фармалізм пры правядзенні штогадовых інвентарызацый.





Удзельнікі мерапрыемства не хавалі праблем, якія нярэдка перашкаджаюць у рабоце з нерухомасцю. Напрыклад, **старшыня Глыбоцкага раённага Савета Галіна УНУКОВІЧ** расказала пра будынак школы, які можна набыць за базавую велічыню. Дык і добра, у чым цяжкасці? Але ж, аказваецца, каб аформіць суправаджальную дакументацыю на аб'ект, трэба вельмі патрацціца, і ў выніку базавая пературварацца ў дзясяткі тысяч рублёў.

У любым выпадку мясцовая ўлада, разумеючы праблемы інвестараў, павінна дапамагаць ім на ўсіх этапах: ад экскурсіі на аб'екты, якія могуць зацікавіць, да нюансаў выкарыстання падчас эксплуатацыі.

Дэпутатаў пазнаёмілі з прадпрымальнікамі, якімі маглі б ганарыцца ў кожным раёне. Адзін з іх валодае гатэлем. Гаспадар стварае каля будынка прыгожы зялёны куточак. Ён жа паралельна займаецца бізнесам у сферах дрэваапрацоўкі, прыдарожнага сэрвісу. Цікава, што старанным працаўнікам, якім дапамагае пазбавіцца ад алкагольнай залежнасці, ён да зарплаты выплачвае і прэмію — каля 100 рублёў.

> За пяць месяцаў бягучага года ў вобласці ўцягнулі ў абарот толькі 50 аб'ектаў, або 10 % ад запланаванага. Знеслі або дэмантавалі 13 будынкаў і збудаванняў, а плануецца на працягу года 201.

Шмат добрых уражанняў народныя выбраннікі атрымалі падчас наведвання прадпрыемства, якое займаецца вырабам вулічнага дэкору з металу. Яно дзейнічае ў будынку, які доўгі час не эксплуатаваўся. Тут могуць зрабіць, напрыклад, дэкаратыўны масток і сабраць яго на месцы, ці карэту, як і скульптуру паштальёна, калі будзе такі заказ.

Каб такіх прыкладаў эфектыўнага выкарыстання нерухомасці было больш, трэба не пакідаць пытанне ўцягвання нерухомасці ў абарот «на потым». У кожнага аб'екта ёсць плюсы, якія трэба актыўна рэкламаваць. І вельмі важна адшукаць тых, каму працаваць будзе прапанаваць нешта з нерухомасці, улічыўшы вытворчыя і іншыя задачы. Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі выязнога прэзідыума.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Вада, дарогі, небяспечны сусед...

## Што хвалявала людзей падчас правядзення суботняй прамой тэлефоннай лініі

**Асноўнай тэмай, з якой звярталіся грамадзяне да старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрыя Харытончыка, стала менавіта камунальная. На працягу трох гадзін работы прамой лініі прагучалі 22 пытанні, з якіх 14 датычыліся непасрэдна жыллёвага фонду і жыллёва-камунальных паслуг.**



Фота БелТА.

Самым масавым стаў сігнал аб праблеме з падачай вады ад жыхароў вёскі Лыкава Магілёўскага раёна. На лінію з адным і тым жа пытаннем звярнуліся аж сем чалавек. Яшчэ адно пытанне па вадзе ўзнікла ў жыхара Глускага раёна, які паскардзіўся на яе якасць у калонцы. Жыхары вёскі Макаранцы Магілёўскага раёна хваляваліся з той нагоды, што прыпыніліся работы па падводцы газу, і пыталіся, ці паспеюць яны завяршыцца да зімы. Заяўніца з Дрыбіна выказала заклапочанасць, што нядаўна яна з мужам і малым дзіцем засялілася ў інтэрнат, але ёсць пагроза, што ў адным блоку з імі будзе жыць сацыяльна небяспечны сусед. Жанчына знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску і вельмі хацела б пазбегнуць такой перспектывы.

Жыхарка абласнога цэнтра звярнула ўвагу, што дзіцячаму садку № 99, у які ходзіць яе дзіця, патрэбны рамонт даху і вокнаў. Яшчэ адзін заяўнік з Магілёва паведаміў, што яго дом знаходзіцца ў раёне санітарнай зоны былога завода Куйбышава. Цяпер прамысловыя будынкі знесены, праведзена рэкультывацыя тэрыторыі, але ў адным з былых адстойнікаў збіраецца і гніе вада. Былі заяўнікі, якія прасілі паспрыяць у рамонце катла, дапамагчы з ацэнкай работы дымаходнай сістэмы. Гучалі пытанні па тэме сельскай гаспадаркі, землеўладання і землекарыстання, архітэктуры, аховы здароўя, адукацыі, аховы навакольнага асяроддзя, фізкультуры і спорту.

— Пытанне па Магілёўскім раёне, дзе, па словах заяўнікаў, не было вады на працягу сямі дзён, стала самым вострым, — адзначыў Дзмітрый Харытончык. — У выхадныя водазабеспячэнне аднавілі, але незразумела, чаму нельга было папярэдзіць людзей пра тыя работы па замене абсталявання, якія там праводзіліся, і арганізаваць падвоз вады. Усе звароты ўзятыя на кантроль, па кожным з іх дадзены даручэнні і вядзецца работа. Яны будуць разгледжаны ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны, а заяўнікі — праінфармаваныя.

Усяго на прамую суботнюю тэлефонную лінію (з улікам гар-, райвыканкамаў) паступіла 73 звароты. Сярод іх лідзіравалі жыллёва-камунальныя (52 пытанні), «дарожныя» і звязаныя з аховай здароўя. У некаторых райвыканкамах тэлефон за тры гадзіны прыёму нават ні разу не пазваніў, але ў большасці раёнаў зарэгістравана да трох званкоў. Рэкардсменам на гэтым фоне стаў Мсціслаў, дзе іх прагучала дзесяць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Магілёў–Краснадар

**Тэма супрацоўніцтва Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў і Заканадаўчага сходу Краснадарскага краю прагучала падчас пасяджэння XXX Канферэнцыі Паўднёва-Расійскай парламенцкай асацыяцыі ў Сочы. Удзел у мерапрыемстве прымаў старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Харытончык.**

— На канферэнцыі абмяркоўваліся агульныя пытанні для вынясення іх на федэральны ўзровень, а таксама распаўсюджванне вопыту пэўных практык і заканадаўчых ініцыятыў на тэрыторыі сваёй акругі, — расказаў старшыня аблсавета. — Разглядаўся прынцып работы такога органа, як асацыяцыя. Гэта тое, што мы зараз актыўна абмяркоўваем як на абласным, так і на рэспубліканскім узроўні. Ёсць цікавы вопыт правядзення пасяджэнняў, абмеркаванняў у камісіі, прыняцця рашэнняў. У рамках работы канферэнцыі адбылося падпісанне плана мерапрыемстваў па рэалізацыі дасягнутых пагадненняў з Краснадарскім краем. Там пазначаны цэлы комплекс мерапрыемстваў і ў сферы маладзёжнай палітыкі, і ў сферы супрацоўніцтва Магілёўскага абласнога Савета і Заканадаўчага сходу з умовай непасрэднага знаёмства на месцах з вопытам і формамі работы двух бакоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДА ЎСЯГО ТРЭБА ПАДЫХОДЗІЦЬ ТВОРЧА...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)***

У «Вайберы» арганізавала групу, дзе мы вядзём са старшынямі аб'яднанняў бурную перапіску, і работа пайшла хутчэй. Кожны дзень нехта штосьці праводзіць і адразу ж дзеліцца інфармацыяй. Я, у сваю чаргу, на сайце гарвыканкама размяшчаю справаздачы і фотаздымкі. А каб прыцягнуць увагу да гарадскіх падзей, бяру ў нашым гарадскім аддзеле ідэалогіі план работ на месяц і раблю рассылку грамадскім аб'яднанням. Яны ахвотна далучаюцца да гэтых мерапрыемстваў.

## Дзень міру

Гэта толькі адзін з прыкладаў супрацоўніцтва. Ініцыятыва зыходзіла ад сацыяльна-культурнага грамадскага аб'яднання «Спадчына».

— Яго кіраўнік прапанаваў правесці сумеснае мерапрыемства «Дзень міру», і гэтую ідэю падтрымалі ў гарвыканкаме, — расказвае Галіна Бяляева.— Было распрацавана Палажэнне аб правядзенні конкурсу відэаролікаў да 75-годдзя вызвалення Беларусі. Яго разаслалі па школах і заклікалі дзяцей расказаць пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Нехта зняў ролік пра дзядулю, нехта пра героя, імем якога названая вуліца. Свае работы дасылалі дзеці з Расіі і нават ЗША, бо інфармацыя была размешчана на розных сайтах. Амерыканскія школьнікі, напрыклад, зрабілі відэафільм пра Хатынь. Гэтыя ролікі мы паказвалі ў сацыяльных сетках, а ў Дзень міру запрасілі ўсе грамадскія аб'яднанні на свята. Прысутнічала больш за трыста школьнікаў, прыйшлі прадстаўнікі дыяспар са сваімі сцягамі, сабраліся афганцы, ветэраны, ваенныя. Прыехалі дэлегацыі з Бранска і Смаленска. Мы раздалі ўдзельнікам выразаных з паперы галубоў. Трэба было напісаць на іх імя чалавека, які зрабіў унёсак у Перамогу, і прымацаваць да паветранага шара. І тут не абышлося без творчасці. Беларусы замацоўвалі сваіх птушак на чырвоных і зялёных шарах, рускія — на белых, чырвоных і сініх. Азербайджанцы, грузіны, армяне — усе выбіралі колер свайго сцяга. У неба адначасова запусцілі больш за чатырыста шароў.

## Вайна вачыма дзяцей

Магілёўская гімназія № 3 на працягу некалькіх гадоў збірала ўспаміны відавочцаў пра вайну. На аснове гэтых матэрыялаў быў зроблены спектакль-рэквіем «Вайна вачыма дзяцей». На прагляд вучні запрасілі прадстаўнікоў аб'яднання малалетніх вязняў фашысцкіх канцлагераў і ветэранаў.

— А я прапанавала прыйсці на яго прадстаўнікам нашых грамадскіх арганізацый, — расказвае Галіна Бяляева. — Сабралася столькі людзей, што нават месцаў у зале не хапала. Мне хацелася, каб дзеці бачылі, колькі ў горадзе розных аб'яднанняў, і ведалі, чым яны займаюцца. А тыя, у сваю чаргу, каб паглядзелі на моладзь. Бо часта даводзіцца чуць, што маладыя людзі сталі абыякавыя, і мне хочацца верыць, што нехта пасля той сустрэчы стаў думаць інакш. Дзеці, напрыклад, прызнаваліся, што калі паказвалі пастаноўку сваім аднагодкам, успрыманне было іншым — зусім не такім, як у тых, хто перажыў ваеннае ліхалецце. Некаторыя з відавочцаў ваенных падзей нават не вытрымлівалі да канца, выходзілі са слязамі на вачах і казалі, што не хапае сіл глядзець, бо гэта ўсё — праўда і ад гэтага ім вельмі балюча.




**На сумесных сустрэчах сумна не бывае.**

## Кава з наступствамі

У каардынацыйны савет уваходзіць і Магілёўская гарадская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў. Аднойчы яны скінулі ў «Вайбер» запрашэнне наведаць кавярню і выпіць кубачак кавы ў рамках акцыі «Інклюзіўны барыста». Такім чынам яны збіралі грошы на лячэнне двухгадовай дзяўчынкі.

— Я гэта запрашэнне пераслала дэпутатам, і яны актыўна ўключыліся ў праект, — расказвае Галіна Бяляева. — Мы патэлефанавалі маці дзяўчынкі, спыталіся, што трэба для дзіцяці. Яна папрасіла электронны танометр, і мы яго купілі. А разам з ім перадалі энную суму грошай. Потым мы паехалі ў кавярню, запрасілі туды маці дзяўчынкі, каб мясцовае тэлебачанне ўзяло ў яе інтэрв'ю.

Арганізатары акцыі былі вельмі здзіўлены: яшчэ ні ў адным горадзе не было такой рэакцыі на яе. Ідэя «Інклюзіўнага барыста» ўзнікла не ў Магілёве, але яна тут прыжылася. Дэпутаты запрасілі на каву бізнесменаў, якія таксама дапамаглі дзяўчынцы. А заадно прапанавалі людзям з абмежаванымі магчымасцямі рабочыя месцы.

Удзельнікі каардынацыйнага савета актыўна падтрымалі добрую справу і ад Таварыства беларускай мовы (ТБМ). Гэта арганізацыя штогод здзяйсняе акцыі па ачыстцы пахаванняў ад смецця і гэтым разам заклікала людзей пачысціць старадаўнія Васкрасенскія могілкі. Там знаходзяцца пахаванні канца XIX — пачатку XX стагоддзя, нашчадкаў амаль не засталося, прыбіраць болей няма каму. Адгукнуліся прадстаўнікі шматлікіх дыяспар, прыйшлі дэпутаты маладзёжнага парламента. А гарвыканкам выдзеліў кантэйнеры для смецця.

— У найбліжэйшых нашых планах з ТБМ — зрабіць GPS-карты могілак, каб людзі, якія жывуць далёка ад Магілёва, бачылі, дзе знаходзяцца гэтыя пахаванні, — адзначыла Галіна Бяляева.

## Узялі пад кантроль дарогі

Летась дэпутаты Магілёўскага гарсавета праанalізавалі і склалі спіс дарог, якім патрэбны рамонт. Прычым зрабілі гэта ў выглядзе фотасправаздач з падрабязным апісаннем. Некаторыя з гэтых дарог былі ўнесены ў планы добраўпарадкавання Магілёва. Астатнія пакуль у рабоце.

— Я звярнулася да старшынь грамадскіх аб'яднанняў, каб і яны падтрымалі справу. Яны таксама дасылалі фота з указаннем месцаў. І гэтыя дарогі ўвайшлі ў агульны спіс, — удакладняе Галіна Бяляева.

Па ініцыятыве няўрымслівай дэпутаткі раз на квартал праходзяць пасяджэнні каардынацыйнага савета з удзелам дэпутатаў Нацыянальнага сходу. Кіраўнікі аб'яднанняў расказваюць аб сваёй рабоце, робяць прэзентацыі, задаюць дэпутатам пытанні.

— А яшчэ запрашаю прадстаўнікоў ад грамадскіх арганізацый на круглыя сталы, якія праводзяцца ў гарвыканкаме, — кажа старшыня каардынацыйнага савета. — Напрыклад, не так даўно падымаліся пытанні аб безбар'ерным асяроддзі. Вельмі актуальная праблема. Праз мяне прадстаўнікі розных аб'яднанняў шукаюць кантакты з іншымі арганізацыямі, і я падказваю. Мне заўсёды радасна, калі завязваецца супрацоўніцтва. Аднойчы дэпутат Нацыянальнага сходу звярнуўся з просьбай заахвоціць актыўных настаўнікаў паходам на канцэрт сімфанічнага аркестра. А я папрасіла падарыць такую магчымасць яшчэ і нашым грамадскім актывістам. Ён з задавальненнем пайшоў насустрач.

— А былі выпадкі, калі грамадскія арганізацыі дапамагалі ў чымсьці звычайным магіляўчанам? — напаследак спыталася я.

— А як жа! — запэўніла Галіна Бяляева. — Аднойчы я атрымала ліст з пытаннем, якія мерапрыемствы, прысвечаныя Аляксандру Пушкіну, плануюцца ў Магілёве. Я звярнулася да рускіх аб'яднанняў, яны перадалі графік сваіх мерапрыемстваў, і мы запрасілі на іх аўтара гэтага ліста. Ён быў прыемна здзіўлены.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


### Извещение о проведении 28 июня 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | здание специализированное для общественного питания» с инвентарным номером 500/С-25880 общей площадью 336,1 кв. м |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Олега Кошевого, 13а |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,0232 га, кадастровый номер 500000000001001873, назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для общественного питания |
| **Продавец имущества** | ОАО «МТЗ», ул. Долгобродская, 29, 220070, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 337 000,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 50 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) обязан согласовать дальнейшее использование приобретенного капитального строения с Минским городским исполнительным комитетом |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **28 июня 2019 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.06.2019 по 26.06.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»)



### РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Нерудпром»

**Лот № 1**. Трансформаторная подстанция КТП–ТК В-400/6/0,4 наружной установки, с инв. № 2849.
**Начальная цена с НДС – 2400,00 бел. руб. Задаток – 200,00 бел. руб.**
**Лот № 2**. Трансформаторная подстанция 2КТП-ТК В-630/6/0,4 наружной установки, с инв. № 156.
**Начальная цена с НДС – 7560,00 бел. руб. Задаток – 650,00 бел. руб.**
**Лот № 3**. MAZ 5516 A5-391 кузов (рама) № Y3M5516A590002849, 2009 г. в.
**Начальная цена с НДС – 11400,00 бел. руб. Задаток – 1000,00 бел. руб.**
**Лот № 4**. МАЗ 5516 А5 кузов (рама) № Y3M5516A580001868, 2008 г. в.
**Начальная цена с НДС – 9960,00 бел. руб. Задаток – 800,00 бел. руб.**

**Местонахождение Лотов №№ 1, 2**: Минский р-н, д. Захаричи, ДСЗ «Заславль»; **Лотов №№ 3, 4**: г. Минск, ул. Асаналиева, 72. **Шаг аукциона** – 100,00 бел. руб.

**Условия аукциона:** 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов): предоплата 100 % в течение 3 (трех) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня проведения аукциона. 4. Передача Лота (Лотов) производится на условиях самовывоза в течение 3 (трех) календарных дней после поступления денежных средств на расчетный счет Продавца

**Аукцион состоится 15.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Нерудпром», г. Минск, ул. Асаналиева, 72, тел. 8 (017) 365 66 07. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, помещение 9, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже Лота №_, ОАО «Нерудпром», проводимом 15.07.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений: 11.07.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов: по Лотам №№ 1, 2 – Василевский Вадим Александрович, тел. 8029-304-64-13; по Лотам №№ 3, 4 – Храмченко Вячеслав Васильевич, тел. 8029-604-06-79

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



В связи с лишением права юридического лица исключить из журнала государственной регистрации первичную профсоюзную организацию открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования» Белорусского профессионального союза работников отраслей промышленности «БЕЛПРОФМАШ», зарегистрированную Администрацией Фрунзенского района г. Минска 22.11.2016 г., свидетельство о государственной регистрации № 1-350.

УНП 100931171

ОРША: ПЕРАЗАГРУЗКА

# КОНКУРС БІЗНЕС-ІДЭЙ АБВЯСЦІЛІ Ў ОРШЫ

**Аршанскі раён увайшоў у лік 12 пілотных раёнаў краіны, на тэрыторыі якіх рэалізуецца праект «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам эканомікі Беларусі.**

Агульны бюджэт праекта складае 9,5 мільёна долараў. Тэрмін рэалізацыі — 36 месяцаў, да 31 студзеня 2022 года, паведамляе «Аршанская газета».

— Мэта праекта — падтрымка эканамічнай ініцыятывы, канкурэнтаздольнасці і інавацый для інклюзіўнага развіцця на мясцовым узроўні, — адзначыў **першы намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргей ПАЦ** на сустрэчы з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу. Ён падкрэсліў важнасць праекта падчас рэалізацыі на Аршаншчыне падпраграмы развіцця малога і сярэдняга бізнесу Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна да 2023 года, а таксама яго ўнікальнасць па стымуляванні прыватнай ініцыятывы, стварэнні новых рабочых месцаў.

Адным з першых і важных этапаў праекта з'яўляецца конкурс бізнес-ідэй, мэта якога — вызначыць канцэптуальны падыход да падтрымкі развіцця прадпрымальніцтва на тэрыторыі пілотных раёнаў праекта. Да ўдзелу ў конкурсе бізнес-ідэй запрашаюцца фізічныя і юрыдычныя асобы, гатовыя рэалізаваць свае ініцыятывы на тэрыторыях пілотных раёнаў праекта: Браслаўскага і Аршанскага (Віцебская вобласць), Быхаўскага і Хоцімскага (Магілёўская вобласць), Брагінскага, Хойніцкага і Жлобінскага (Гомельская вобласць), Кобрынскага і Бярозаўскага (Брэсцкая вобласць), Лідскага (Гродзенская вобласць), Маладзечанскага і Барысаўскаг (Мінская вобласць).

— Прадстаўленыя на конкурс бізнес-ідэі будуць пакладзены ў аснову аналізу патэнцыялу кожнага праекта і разгледжаны на пасяджэнні раённых саветаў па развіцці прадпрымальніцтва з удзелам нацыянальных і міжнародных экспертаў. Найлепшыя з іх будуць прапанаваны для ўключэння ў раённыя планы развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, — расказала **кіраўнік праекта Людміла САКАЛОЎСКАЯ.**

Фінансаванне конкурсу на дадзеным этапе не прадугледжана. У далейшым ініцыятывам, уключаным у адпаведныя раённыя планы, будуць дадзены дадатковыя перавагі ў конкурсах на атрыманне фінансавай падтрымкі ў рамках праекта:

1) падтрымка бізнес-інкубатараў (агульны індыкатыўны бюджэт конкурсу — 1,2 мільёна долараў);

2) падтрымка стартапаў і кластарных ініцыятыў (агульны індыкатыўны бюджэт конкурсу — 4,165 мільёна долараў);

3) падтрымка арганізацый, зацікаўленых стаць пастаўшчыкамі паслуг па мікрафінансаванні (агульны індыкатыўны бюджэт конкурсу — 360 тысяч долараў);

4) падтрымка прадпрыемстваў, накіраваных на рашэнне сацыяльна значных праблем (агульны індыкатыўны бюджэт конкурсу — 1,8 мільёна долараў).

Тэрмін падачы заявак на конкурс бізнес-ідэй — да 30 чэрвеня 2019 года. Падрабязную інфармацыю можна пагледзець на сайце Аршанскага райвыканкама.

Арганізатары інфармацыйнай сустрэчы звярнуліся да прадпрымальнікаў, а таксама да найбольш актыўных жыхароў раёна з прапановай прыняць удзел у конкурсе, бо ідэй для разгортвання прадпрымальніцкай дзейнасці навокал шмат. Яны могуць быць звязаныя з прафесіяй або хобі, а магчыма, і з даўняй марай пачаць сваю справу, якая ў далейшым застанецца дзецям і ўнукам. Важна праявіць прыватную ініцыятыву і абгрунтаваць, наколькі эканамічная і карысная ваша ідэя для далейшага развіцця і росквіту рэгіёна.

ЗАПРАШАЛЬНІК

## «ВЯНОК СЯБРОЎСТВА»

### Бабруйск запрашае на Міжнародны фестываль народнай творчасці

**З 28 па 30 чэрвеня горад на Бярэзіне стане культурнай пляцоўкай для 22 творчых калектываў і выканаўцаў народнай творчасці з 15 краін свету. У межах міжнароднага форуму гасцей і жыхароў горада чакае насычаная культурная праграма.**

Дарэчы, Міжнародны фестываль народнай творчасці «Вянок сяброўства» праводзіцца ў Бабруйску з 2003 года. Ён з'яўляецца візітоўкай горада і дэманструе шырокі і шматгранны спектр народнай творчасці. За гады свайго існавання ён аб'яднаў пад дэвізам сяброўства больш за 800 чалавек з 43 краін пяці кантынентаў. У розныя гады яго ўдзельнікамі былі творчыя калектывы з Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы, Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Ізраіля, Індыі, Кітая і нават ЗША.

У фестывальных днях прымаюць удзел творчыя калектывы, у рэпертуары якіх адлюстраваны нацыянальныя культурныя традыцыі краіны-ўдзельніцы.

Як паведамілі арганізатары, фестываль не з'яўляецца конкурсам і праходзіць пад дэвізам роўнай значнасці і мастацкай каштоўнасці яго ўдзельнікаў, нацыянальных культурных традыцый. Згодна з фестывальнай праграмай замежныя калектывы і выканаўцы прымаюць удзел у конкурсе «Вянок як сімвал фестывалю — у падарунак фестывалю», а таксама на ўрачыстым адкрыцці і закрыцці свята, тэатралізаваным шэсці і вечарах сяброўства. Цікава, што кожны калектыў ці выканаўца выступае з канцэртнай праграмай на прадпрыемствах і арганізацыях Бабруйска, знаёміцца з прадукцыяй, якую яны выпускаюць, і гісторыяй горада.

## На «Мяжу» ў Гродна!

**Фестываль сярэднявечнай культуры запрашае ўсіх ахвотных у абласны цэнтр у суботу, 15 чэрвеня.**




У Каложскім парку можна будзе пабачыць шоу і турнір лучнікаў, турнір «шчыт-меч», бугурт (масавыя баі 5х5), начную рэканструкцыю бойкі, экскурсію асаблівую ад прагляду пастаноўкі вандроўнага тэатрыка «Гістрыён», патанцаваць разам з калектывам SelvaMagica ды паслухаць гурты «Скудрынка», Viatores, «Рокаш», Nevrida. Таксама можна будзе апынуцца на вялікім сярэднявечным кірмашы, дзе ўдзельнікі будуць дэманстраваць рамёствы, пакатацца на конях. Будуць працаваць аніматары і фотазоны.

Завершыцца фестываль сярэднявечнай культуры вогненным шоу ад тэатра ErgoBibamus.

**Извещение о проведении 18 июля 2019 года аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Общепит «Школьник»**

| | |
|---|---|
| 1. Наименование объекта и его местонахождение | Часть капитального строения с инвентарным номером 110/С-90997 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 21 |
| 2. Арендуемая площадь, кв. м | 110,7 |
| 3. Характеристика объекта | Имеется электроснабжение, водоснабжение, отопление, телефон, развитая транспортная инфраструктура |
| 4. Начальная цена продажи права заключения договора аренды, базовых арендных величин | 27,675 |
| 5. Сумма задатка, базовых арендных величин | 2,7675 |
| 6. Условия аукциона | Организация розничной торговли непродовольственной группой товара в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями |
| 7. Срок аренды изолированных помещений | 3 года |
| 8. Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества | -3- |
| 9. Размер уплачиваемого штрафа, базовых величин | 30 |
| 10. Арендодатель объекта, его местонахождение | ОАО «Общепит «Школьник», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4 |
| 11. Организатор аукциона | ОАО «Общепит «Школьник» |

1. Аукцион состоится 18 июля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4 (2-й этаж).

2. Для участия в аукционе необходимо:

а) предоставить организатору аукциона заверенную банком копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный счет BY02BLBB30120200167591001001 в ЦБУ № 405 ОАО «Белинвестбанк» г. Барановичи, БИК BLBBBY2X, г. Барановичи, ул. Димитрова, 15, УНП 200167591, ОКПО 01567973. Срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе; задаток перечисляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;

б) подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе установленной формы с приложением следующих документов: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и документ, удостоверяющий личность; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов на участие в аукционе представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие;

в) заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. После регистрации организатором аукциона заявления со всеми необходимыми документами лицо, желающее принять участие в аукционе, считается допущенным к участию и получает билет участника аукциона.

3. Лицо, допущенное к участию в аукционе, до начала аукциона имеет право отказаться от участия в нем. Отказом признается как письменное заявление, так и неявка на аукцион.

4. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона устанавливается комиссией по проведению аукционов от 5 % до 15 %. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %.

5. Спорные вопросы, возникающие в ходе проведения аукциона, решаются комиссией.

6. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) обязан:

– в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на расчетный счет ОАО «Общепит «Школьник» сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной суммы задатка, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;

– в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола заключить договор аренды с арендодателем. В случае невыполнения одного из условий результаты аукциона аннулируются, внесенный задаток победителю аукциона (лицу, приравненному к победителю) не возвращается.

7. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

8. Договор аренды по результатам аукциона заключается исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

9. Организатор аукциона вправе в любое время отказаться от проведения аукциона, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения, уведомив об этом лиц, подавших заявление на участие в нем.

10. Задаток возвращается участникам аукциона, не выигравшим торги, лицам, отказавшимся от участия в аукционе, в течение 5 рабочих дней со дня подачи письменного заявления.

11. Штраф уплачивается участниками аукциона и (или) его победителями (приравненными к нему лицами) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением.

12. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225409, г. Барановичи, ул. Красноармейская, д. 4, каб. 7 ОАО «Общепит «Школьник» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни по 15 июля 2019 г. включительно. Контактный телефон в г. Барановичи (0163) 64 19 64.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 13 чэрвеня 2019 года.**